Круг вроде бы замкнулся. Но вскоре в Минздраве пересмотрели свое отношение к вышеизложенному делу. Сам министр дал ответ, в котором признал, что министерство "в основном разделяет мнение комиссии Верховного Совета" и "в III квартале проведет комплексную проверку работы горздравотдела города Гомеля с соответствующими выводами и предложениями".

Пока же руководство думает, как в данной ситуации поступить, ведомство Слепокуровой "успешно" продолжает дело с "липовой" отчетностью. Всплыла история с красной икрой, закупленной на средства облисполкома и предназначенной для благотворительной помощи больным детям и семьям погибших в Афганистане. В списках подделанные подписи. Есть двойные списки. Доказано, что икру получили дети ответственных медработников.

Однако Татьяна Михайловна Слепокурова снова не хочет признавать явный подлог и считает, что обнародование факта не что иное, как козни ее недругов. Надо полагать, что и в горисполкоме разделяют это мнение.

Что ж, жизнь расставит все точки над "і". Белое станет белым, черное — черным. Подождем...

Ці чулі?

Купіце энергаталон... на пошце

Мінскія сувязісты паклапаціліся, каб гараджане не марнавалі час у доўгіх чэргах. З гэтага часу ва ўсіх аддзяленнях сувязі прымаюцца плацяжы за камунальныя паслугі, дзіцячы сад, аплачваюцца квітанцыі за аўтастаянку. На пошце нават можна купіць праязныя і талоны на ўсе віды транспарту.

— З лёгкай рукі мэра горада мы зрабілі гэта не толькі для зручнасці мінчан, але і з карысцю для сябе, — гаворыць начальнік дзяржаўнага аб'яднанага прадпрыемства "Мінская пошта" Аляксандр Малыка. — Новаўвядзенне дапаможа сувязістам зводзіць канцы з канцамі. На 30 працэнтаў знізіўся аб'ём падпіскі на другое паўгоддзе ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года. Страціўшы падпісчыкаў, у нас узнікла нямала праблем. Дастаўка ж карэспандэнцыі давала магчымасць мець работу многім паштальёнам. Такая фінансавая сітуацыя, вядома ж, не магла не адбіцца на зарплаце паштовых работнікаў. Яна па-ранейшаму адна з самых нізкіх. Таму пошта і занялася не ўласцівымі ёй паслугамі.

Што ж, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло.

Наталля НЕВІДОМАЯ, Белінфарм.

г.Мінск.

Третий — не лишний?

По принципу "третий — лишний" решили на сей раз проигнорировать традиционный, проходящий каждое первое воскресенье июля праздник на кургане Дружбы официальные круги Латвии.

В этом, очевидно, проявилось их новое отношение к антифашистскому сопротивлению, одним из символов которого стал курган-памятник, насыпанный на стыке территорий Беларуси, России и Латвии 34 года назад.

И все-таки торжества в честь героев интернациональной партизанской борьбы с гитлеровскими оккупантами, организованные нынче белорусской стороной, не обошлись без представителей соседнего прибалтийского государства. Неофициальная делегация ветеранов-латышей привычно "форсировала" речушку, служащую границей Лудзенского района, и радостно присоединилась к бывшим товарищам по оружию, приехавшим со стороны Верхнедвинска и Себежа. Праздник, как всегда, был искренним и трогательным. В следующий раз его организацию берут на себя россияне.

Сергей БУТКЕВИЧ.

 НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Закон Республики Беларусь

О праве собственности на землю

Настоящий Закон устанавливает формы земельной собственности, основания возникновения, изменения и прекращения частной собственности на землю, регулирует порядок осуществления прав и обязанностей собственников земли.

Земельные отношения, связанные с приватизацией зданий, строений, сооружений, находящихся в государственной собственности, регулируются специальными актами земельного законодательства Республики Беларусь.

Статья 1. Собственность на землю

Собственность на землю в Республике Беларусь выступает в государственной и частной формах.

Земля может принадлежать на праве общей (долевой или совместной) собственности нескольким собственникам независимо от форм собственности.

Статья 2. Государственная собственность на землю

В собственности Республики Беларусь находятся все земли, за исключением земель, переданных в частную собственность.

Земли, находящиеся в государственной собственности, передаются Советами народных депутатов в соответствии с их компетенцией в пользование (аренду), владение, а также отчуждаются в частную собственность в порядке, предусмотренном земельным законодательством Республики Беларусь.

Право владения и право пользования землей (аренда земли) колхозами, совхозами, другими сельскохозяйственными предприятиями и организациями независимо от форм собственности, крестьянскими (фермерскими) хозяйствами гарантируются государством согласно действующему законодательству.

Статья 3. Частная собственность на землю

В частной собственности находятся земли, переданные в собственность гражданам Республики Беларусь из государственной собственности в соответствии с земельным законодательством.

Право частной собственности на земельный участок удостоверяется соответствующим Советом народных депутатов, о чем делается запись в земельно-кадастровых документах с последующей выдачей Государственного акта на право частной собственности на землю.

Статья 4. Субъекты права частной собственности на землю

Субъектами права частной собственности на землю являются только граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Возврат земли лицам, утратившим право собственности на нее до принятия настоящего Закона, или их наследникам не допускается. Эти лица могут получить землю в собственность на общих основаниях.

Статья 5. Предоставление земельных участков иностранным инвесторам

Иностранные юридические и физические лица, предприятия с иностранными инвестициями, а также иностранные государства, международные объединения и организации не могут иметь в Республике Беларусь земельные участки на праве собственности.

Земельные участки субъектам, указанным в части первой настоящей статьи, предоставляются в пользование на условиях аренды сроком до 99 лет в соответствии с Кодексом Республики Беларусь о земле.

Статья 6. Права и обязанности частных собственников

Частные собственники земельных участков имеют права и несут обязанности, предусмотренные статьями 45 и 46 Кодекса Республики Беларусь о земле, а также имеют право отчуждать земельные участки, сдавать их в залог, аренду и передавать по наследству в соответствии с настоящим Законом.

Статья 7. Земельные участки, которые могут находиться в частной собственности

В частной собственности могут находиться земельные участки, приобретенные:

для ведения личного подсобного хозяйства;

для строительства и обслуживания жилого дома;

для садоводства и дачного строительства.

Общая площадь земельных участков, приобретаемых в частную собственность для ведения личного подсобного хозяйства, не должна превышать размеров, установленных частью второй статьи 54 Кодекса Республики Беларусь о земле.

Площадь земельных участков, приобретаемых в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома, для садоводства и дачного строительства, определяется в каждом случае согласно статьям 53 и 54 Кодекса Республики Беларусь о земле.

Статья 8. Земли, не подлежащие передаче в частную собственность

Не подлежат передаче в частную собственность:

земли общего пользования (площади, улицы, проезды, дороги, набережные, парки, лесопарки, бульвары, скверы и т.п.);

земли транспорта и связи;

земли, предоставленные для нужд обороны;

земельные участки на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению вследствие катастрофы на Чернобыльской АЭС (зоны эвакуации (отчуждения) и первоочередного отселения);

земли заповедников, национальных и дендрологических парков, ботанических садов, заказников, памятников природы и архитектуры;

земли оздоровительного, рекреационного и историко-культурного назначения;

земли лесного фонда;

земли водного фонда;

сенокосы, пастбища и другие угодья населенных пунктов, используемые для общих нужд населения;

земельные участки, предоставленные или предоставляемые гражданам для целей, указанных в части первой статьи 7 настоящего Закона, если в соответствии с генеральными планами, проектами планировки и застройки городов и других населенных пунктов предусмотрено иное целевое использование этих участков;

служебные земельные наделы;

земли населенных пунктов, дачных и садоводческих товариществ на площадях залегания разведанных и в установленном порядке утвержденных месторождений полезных ископаемых. Перечень таких населенных пунктов, дачных и садоводческих товариществ утверждается Советом Министров Республики Беларусь.

Статья 9. Порядок передачи земель, находящихся в государственной собственности, в частную собственность граждан

Земли, находящиеся в собственности Республики Беларусь, указанные в частях первой, второй и третьей статьи 16 Кодекса Республики Беларусь о земле, передаются в частную собственность соответственно сельскими, городскими (поселковыми), районными Советами народных депутатов.

Передача производится по заявлению гражданина после внесения платы за землю.

Граждане, имеющие во владении и пользовании земельные участки, предоставленные им до принятия настоящего Закона для ведения личного подсобного хозяйства, строительства и обслуживания жилого дома, садоводства и дачного строительства, приобретают один из этих участков по льготной цене в соответствии с частью второй статьи 11 настоящего Закона.

Также по льготной цене приобретают в собственность земельные участки для строительства и обслуживания жилого дома граждане, нуждающиеся в улучшении жилищных условий в соответствии с жилищным законодательством Республики Беларусь.

Во всех остальных случаях земельные участки приобретаются в собственность по нормативной цене, устанавливаемой согласно части первой статьи 11 настоящего Закона, и по договорной цене (не ниже нормативной), если это предусмотрено законодательством Республики Беларусь.

Граждане, указанные в части третьей настоящей статьи и не подавшие заявление или не внесшие плату в течение 18 месяцев с момента вступления в силу настоящего Закона, теряют право на приобретение земельного участка в собственность по льготной цене.

По обоснованной просьбе гражданина местный Совет народных депутатов может отсрочить внесение платы (ее части) за земельный участок, приобретаемый в собственность, но не более чем на два года.

До полного внесения платы за землю гражданину запрещается отчуждать ее, а также сдавать в аренду и в залог.

Статья 10. Порядок осуществления сделок с земельными участками

Сделки по отчуждению гражданам земельных участков, находящихся в государственной собственности, совершаются на основании письменного решения соответствующего Совета народных депутатов.

Сделки по отчуждению земельных участков, находящихся в частной собственности, совершаются в письменной форме, нотариально удостоверяются и регистрируются в исполнительном комитете Совета народных депутатов, уполномоченного передавать такие участки в частную собственность.

Собственники земельных участков, приобретенных для строительства и обслуживания жилого дома, садоводства и дачного строительства, имеют право отчуждать земельные участки соответствующим местным Советам народных депутатов и гражданам Республики Беларусь при условии сохранения целевого назначения этих земель в соответствии с земельным законодательством Республики Беларусь. Жилые дома, дачи и садовые домики могут отчуждаться субъектам права частной собственности на землю только вместе с земельными участками, если они находятся в размерах, предусмотренных соответственно частью первой статьи 53 и частью второй статьи 54 Кодекса Республики Беларусь о земле, кроме случаев продажи строений на снос.

Отчуждение земельных участков, приобретенных гражданами в собственность для ведения личного подсобного хозяйства, производится по разрешению местных Советов народных депутатов и при сохранении целевого назначения земель.

В случаях приобретения жилого дома, дачи, садового домика в собственность лицом, не имеющим права на получение в собственность земельного участка, имеющего отношение к такому строению, этот участок выкупается у собственника соответствующим Советом народных депутатов за плату по ценам, действующим на момент выкупа.

Если бывший собственник жилого дома имеет другой дом в том же населенном пункте и постоянно проживает в нем, он может сохранить в собственности земельные участки для ведения личного подсобного хозяйства в размерах, предусмотренных частью второй статьи 7 настоящего Закона.

Статья 11. Цена земли

Нормативная цена земли при продаже ее местными Советами народных депутатов устанавливается Советом Министров Республики Беларусь исходя из качества земли и ее местоположения.

Льготная цена земли устанавливается в размере пятикратной ставки земельного налога, уплачиваемого за эту землю, в соответствии с Законом Республики Беларусь "О плате за землю", на момент выкупа.

Средства, поступающие от продажи земли, отчуждаемой в частную собственность, направляются в специальный внебюджетный фонд соответствующего местного Совета народных депутатов и используются на охрану земель, повышение их качества и социальное развитие территорий.

Цена земли по сделкам между гражданами устанавливается участниками сделки.

Статья 12. Наследование земельных участков

Наследование земельных участков осуществляется согласно гражданскому законодательству Республики Беларусь, поскольку оно не противоречит настоящему Закону.

Земельный участок не передается по наследству в случаях, когда ни один из наследников не может быть собственником земли. В этих случаях земельный участок переходит в собственность местного Совета, а наследники получают денежную компенсацию, равную сумме, выплачиваемой при осуществлении выкупа соответствующих земельных участков Советом народных депутатов. Вместо компенсации наследникам по их желанию соответствующие земельные участки могут быть предоставлены местными Советами народных депутатов в пользование (аренду) при сохранении их целевого назначения в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Статья 13. Залог земельного участка

Земельные участки, находящиеся в частной собственности, могут являться предметом залога только в качестве обеспечения своевременного возврата банковского кредита.

В случае неисполнения залогодателем обеспеченного залогом обязательства банк-залогополучатель имеет право от имени залогодателя реализовать при сохранении целевого назначения земельный участок соответствующему Совету народных депутатов или гражданину, который может быть собственником такого участка, и из вырученной суммы удовлетворить свои претензии к залогодателю.

Статья 14. Аренда земельного участка

Собственники земельных участков, приобретенных для ведения личного подсобного хозяйства, на период временной нетрудоспособности (сроком до одного года), обучения на дневных отделениях учебных заведений, прохождения действительной срочной воинской службы и военных сборов могут передавать земельные участки в аренду гражданам Республики Беларусь. В случаях наследования таких земельных участков несовершеннолетними наследниками допускается передача участков в аренду другим гражданам законными представителями наследников под контролем местных Советов народных депутатов до приобретения наследниками полной дееспособности.

Собственники земельных участков, приобретенных для строительства и обслуживания жилого дома, садоводства и дачного строительства, могут передавать их в аренду при условии сохранения целевого назначения земель, а также дома, дачи или садовые домики вместе с земельными участками. Такие земельные участки могут передаваться в аренду только вместе с земельным участком в размерах, предусмотренных соответственно частью первой статьи 53 и частью второй статьи 54 Кодекса Республики Беларусь о земле.

Статья 15. Основания прекращения права частной собственности на землю

Право частной собственности на земельный участок (его часть) прекращается путем передачи земельного участка (его части) в собственность Республики Беларусь в случаях добровольного отчуждения земли местному Совету народных депутатов и принудительного изъятия земельного участка, а также в случаях, указанных в частях третьей и пятой статьи 10, частью второй статьи 12 и частью второй статьи 13 настоящего Закона.

Статья 16. Случаи, при которых допускается принудительное изъятие земельных участков

Принудительное изъятие земельных участков, находящихся в частной собственности, осуществляется по решению суда:

для государственных или общественных нужд;

при систематическом невнесении земельного налога в течение сроков, установленных законодательством Республики Беларусь (с удержанием задолженности по налогам);

в случаях утраты гражданства Республики Беларусь, выезда на постоянное место жительства за пределы Республики Беларусь, за исключением выезда лиц, при котором эти лица приравниваются к лицам, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь, согласно законодательным актам Республики Беларусь;

в случае выкупа земельного участка, приобретенного для ведения личного подсобного хозяйства, в соответствии с частью пятой статьи 10;

при использовании земли не по целевому назначению;

при неиспользовании по целевому назначению в течение одного года земельного участка, приобретенного для ведения личного подсобного хозяйства, и двух лет — в остальных случаях;

при невыполнении требований природоохранного режима использования земель;

при использовании земельного участка способами, приводящими к снижению плодородия почв, их химическому и радиоактивному загрязнению, ухудшению экологической обстановки.

Решение о принудительном изъятии земельного участка за нарушение земельного законодательства принимается на основании материалов, свидетельствующих о том, что после получения предупреждения от уполномоченного лица собственник земельного участка не принял мер к устранению в установленный срок допущенных нарушений.

Статья 17. Порядок передачи земель, находящихся в частной собственности, в собственность Республики Беларусь

Передача земель, находящихся в частной собственности, в собственность Республики Беларусь производится после их выкупа и возмещения в полном объеме убытков согласно статье 107 Кодекса Республики Беларусь о земле, за исключением случаев, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

При изъятии земельного участка для государственных и общественных нужд вместо выкупа по желанию собственника ему предоставляется в частную собственность равноценный земельный участок, а также производится строительство на новом месте физическими или юридическими лицами, для которых отводятся земельные участки, жилых, производственных и иных построек взамен изымаемых.

Допускается добровольное безвозмездное отчуждение земельного участка, находящегося в частной собственности, в собственность Республики Беларусь.

Выкуп земельных участков, которые в соответствии со статьей 16 Кодекса Республики Беларусь о земле предоставляются по решению сельских, поселковых и городских Советов народных депутатов, производится этими Советами, а земельных участков, которые предоставляются по решению районных, областных Советов народных депутатов или Верховного Совета Республики Беларусь, — районными Советами народных депутатов.

Выкуп земельных участков, а также возмещение убытков производятся за счет средств юридических и физических лиц, которым предоставляются изымаемые земельные участки, в сроки, установленные судом, но не свыше трех месяцев со дня изъятия земельных участков.

Выкуп земельных участков, не предоставляемых непосредственно после выкупа юридическим или физическим лицам, производится соответствующим местным Советом народных депутатов за свой счет в течение трех месяцев с момента передачи земельного участка в собственность Республики Беларусь.

При выкупе собственнику земельного участка возмещаются расходы, связанные с улучшением качества земли, за исключением случаев изъятия за использование земли не по целевому назначению, систематическое невыполнение мероприятий по охране и защите земель, сохранению плодородия и других полезных свойств земли, использование земельного участка способами, приводящими к снижению плодородия почв, их химическому и радиоактивному загрязнению, ухудшению экологической обстановки. Порядок возмещения указанных расходов определяется Советом Министров Республики Беларусь.

Статья 18. Плата за земельные участки, находящиеся в частной собственности

Граждане, являющиеся собственниками земельных участков, облагаются ежегодно земельным налогом в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Статья 19. Порядок рассмотрения споров, связанных с правом собственности на землю

Все споры, связанные с правом собственности на землю, рассматриваются в судебном порядке.

Статья 20. Международные договоры

Если международным договором Республики Беларусь установлены иные правила, чем те, которые содержатся в настоящем Законе, то применяются правила международного договора.

Председатель Верховного Совета Республики Беларусь С.ШУШКЕВИЧ.

16 июня 1993 г.

г.Минск.

Постановление Верховного Совета Республики Беларусь

О введении в действие Закона Республики Беларусь "О праве собственности на землю"

Верховный Совет Республики Беларусь **постановляет**:

1. Ввести в действие Закон Республики Беларусь "О праве собственности на землю" с 1 сентября 1993 года.

2. Закон Республики Беларусь "О праве собственности на землю" применяется к правоотношениям, возникшим после введения его в действие.

К правоотношениям, возникшим до 1 сентября 1993 года, названный Закон применяется к тем правам и обязанностям, которые возникнут после введения Закона в действие.

3. В дальнейшем до приведения законодательства Республики Беларусь в соответствие с Законом Республики Беларусь "О праве собственности на землю" действующие акты законодательства применяются в той части, в которой они не противоречат названному Закону.

4. Установить, что лица, выехавшие за пределы Республики Беларусь в связи со служебными обязанностями или обучением, лечением, направлением на работу за границу, приравниваются к постоянно проживающим на территории Республики Беларусь при решении вопросов о праве собственности на землю.

5. Поручить Совету Министров Республики Беларусь:

до 1 октября 1993 года:

определить порядок выкупа земли и установить ее нормативную цену;

разработать и утвердить форму договора купли-продажи земли, Государственного акта на право частной собственности на землю;

разработать и утвердить Государственную программу охраны и рационального использования земель, предусмотрев в ней мероприятия по организационно-правовому, кадровому, научному и материально-техническому обеспечению ее осуществления;

до 1 ноября 1993 года:

представить в Верховный Совет Республики Беларусь предложения о приведении законодательных актов Республики Беларусь в соответствие с Законом Республики Беларусь "О праве собственности на землю";

в целях усовершенствования Закона Республики Беларусь "О правовом режиме территорий, подвергшихся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС" внести в Верховный Совет Республики Беларусь предложения о социальной защите граждан при приобретении на этих территориях земельных участков в собственность;

привести решения правительства Республики Беларусь в соответствие с Законом, а также обеспечить пересмотр и отмену министерствами, государственными комитетами и ведомствами Республики Беларусь их нормативных актов, противоречащих данному Закону.

6. Совету Министров Республики Беларусь и Национальному банку Республики Беларусь до 1 ноября 1993 года разработать порядок передачи земельных участков в залог для получения банковского кредита, а также определить банк, который имеет право принимать землю в залог.

7. Районным Советам народных депутатов, Комитету по земельной реформе и землеустройству при Совете Министров Республики Беларусь при оформлении документов, удостоверяющих право владения или право постоянного пользования землей колхозами, совхозами, другими сельскохозяйственными предприятиями, предусмотреть создание необходимого запаса земель для выделения гражданам для ведения личного подсобного хозяйства, строительства и обслуживания жилого дома, садоводства и дачного строительства, огородничества.

Председатель Верховного Совета Республики Беларусь С.ШУШКЕВИЧ.

16 июня 1993 г.

г.Минск.

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб страхаванні

ГЛАВА І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Адносіны, якія рэгулююцца гэтым Законам

Гэты Закон накіраваны на забеспячэнне страхавой абароны інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб, фарміраванне рынку страхавых паслуг і рэгулюе адносіны ў галіне страхавання паміж страхоўшчыкамі і страхавальнікамі, адносіны страхоўшчыкаў паміж сабой, а таксама адносіны па дзяржаўнаму рэгуляванню страхавой дзейнасці.

Дзеянне гэтага Закона не распаўсюджваецца на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне.

Артыкул 2. Заканадаўства аб страхаванні

Заканадаўства аб страхаванні складаецца з гэтага Закона, а таксама іншых актаў заканадаўства, што выдаюцца ў адпаведнасці з ім.

Артыкул 3. Паняцце страхавання

Страхаванне ўяўляе сабой сістэму адносін па абароне маёмасных інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб, асабістых немаёмасных інтарэсаў фізічных асоб шляхам фарміравання за кошт страхавых узносаў (страхавых прэмій), якія выплачваюцца гэтымі асобамі, грашовых фондаў, прызначаных для выплаты страхавых сум і пакрыцця страт пры надыходзе страхавых выпадкаў.

Артыкул 4. Формы страхавання

Страхаванне можа ажыццяўляцца ў формах абавязковага і добраахвотнага страхавання.

Страхаванне з'яўляецца абавязковым, калі гэта прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. У астатніх выпадках страхаванне з'яўляецца добраахвотным.

Віды, умовы і парадак правядзення абавязковага страхавання вызначаюцца заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аб абавязковым страхаванні.

Аперацыі па абавязковаму страхаванню праводзяцца дзяржаўнымі страхавымі арганізацыямі, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае. Дзяржава гарантуе выплату страхавальнікам страхавых кампенсацый або страхавых сум па абавязковых відах страхавання пры надыходзе страхавых выпадкаў, калі страхаванне праводзілася дзяржаўнай страхавой арганізацыяй.

Умовы добраахвотнага страхавання вызначаюцца дагаворам бакоў у адпаведнасці з заканадаўствам.

Артыкул 5. Аб'ект страхавання

Аб'ектам страхавання прызнаюцца маёмасць, жыццё, рызыка і іншыя аб'екты, з якімі звязаны страхавыя інтарэсы: маёмасныя інтарэсы юрыдычных і фізічных асоб, а таксама асабістыя немаёмасныя інтарэсы фізічных асоб.

Страхавы інтарэс павінен існаваць у момант заключэння дагавора страхавання.

Страхавы інтарэс — мера матэрыяльнай зацікаўленасці ў страхаванні.

Маёмасны інтарэс выражаецца ў атрыманні кошту застрахаванай маёмасці.

Асабісты немаёмасны інтарэс заключаецца ў атрыманні страхавой сумы ў выпадку надыходу падзей, абумоўленых дагаворам страхавання.

Артыкул 6. Страхоўшчыкі

Страхоўшчыкамі (страхавымі арганізацыямі) могуць быць дзяржаўныя страхавыя арганізацыі, акцыянерныя страхавыя таварыствы, таварыствы з абмежаванай або дадатковай адказнасцю, якія ствараюцца з мэтай ажыццяўлення страхавой, а таксама іншай дзейнасці, што вызначаецца гэтым Законам, пры наяўнасці ў іх статутнага, рэзервовага фондаў і рэзерваў у агульнай суме не менш пяці тысяч, а для спецыяльна ствараемых перастраховачных арганізацый не менш пятнаццаці тысяч мінімальных заработных плат у грашовай форме, якія прайшлі рэгістрацыю і атрымалі ліцэнзію на права правядзення пэўнага віду страхавання або перастрахавання.

Пры правядзенні страхавых і перастраховачных аперацый у замежнай валюце страхавая арганізацыя павінна мець фонд у адпаведнай валюце ў размеры не менш пяці тысяч, а перастраховачная — пятнаццаці тысяч мінімальных заработных плат па дзеючаму афіцыяльнаму курсу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

У страхавых арганізацыях з замежнымі інвестыцыямі доля замежных удзельнікаў не павінна перавышаць 49 працэнтаў статутнага фонду.

Артыкул 7. Страхавальнікі

Страхавальнікамі прызнаюцца юрыдычныя і фізічныя асобы, якія выплачваюць страхавыя ўзносы і ўступаюць у канкрэтныя страхавыя адносіны са страхоўшчыкам (страхавой арганізацыяй).

Страхавальнікі маюць права заключаць дагаворы страхавання ў інтарэсах і ад імя трэціх асоб.

Юрыдычныя і фізічныя асобы Рэспублікі Беларусь маюць права заключаць дагаворы страхавання толькі са страхоўшчыкамі (страхавымі арганізацыямі) Рэспублікі Беларусь.

Замежныя юрыдычныя і фізічныя асобы, якія інвесціруюць свой капітал у эканоміку Рэспублікі Беларусь, могуць застрахаваць свой маёмасны інтарэс толькі ў страхоўшчыкаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Страхавыя пасрэднікі

Заключэнне і выкананне дагавора страхавання можа ажыццяўляцца праз страхавых пасрэднікаў (агентаў і брокераў).

Страхавы агент з'яўляецца прадстаўніком страхоўшчыка, якому апошні даручае на падставе кантракта ад імя страхоўшчыка за пэўнае ўзнагароджанне ажыццяўленне страхавой дзейнасці.

Абавязацельствы, прынятыя агентам у межах атрыманых паўнамоцтваў ад імя страхоўшчыка, выконваюцца апошнім, як калі б яны былі прыняты ім самастойна.

Страхавы брокер з'яўляецца незалежным пасрэднікам, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на падставе пагадненняў са страхавальнікамі і страхоўшчыкамі.

Пасрэдніцкая дзейнасць па страхаванню, звязаная з заключэннем дагавораў страхавання ад імя замежных страхавых арганізацый, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не дапускаецца, калі міждзяржаўнымі пагадненнямі з удзелам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана іншае.

Артыкул 9. Страхавы выпадак і страхавая рызыка

Страхавым выпадкам прызнаецца падзея, з надыходам якой заканадаўства або дагавор страхавання звязваюць выплату страхавой сумы або страхавой кампенсацыі.

Пералік страхавых выпадкаў па абавязковаму страхаванню вызначаецца заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аб абавязковым страхаванні, а па добраахвотнаму страхаванню — умовамі дагавора страхавання.

Страхавая рызыка — верагодны надыход страхавога выпадку — выражае аб'ём магчымай адказнасці страхоўшчыка па таму або іншаму віду страхавання.

Артыкул 10. Страхавы кошт

Страхавым коштам (страхавой ацэнкай) прызнаецца кошт маёмасці, з якой звязваецца страхавы інтарэс, што вызначаецца пагадненнем бакоў на момант заключэння дагавора страхавання, калі заканадаўствам не прадугледжана іншае.

Узаемна ўзгодненыя бакамі страхавы кошт не можа быць імі аспрэчаны.

Па абавязковаму маёмаснаму страхаванню страхавая сума не можа перавышаць страхавы кошт.

Артыкул 11. Страхавая сума і страхавая кампенсацыя

Страхавой сумай прызнаецца сума грашовых сродкаў, у межах якой страхоўшчык абавязаны правесці выплату пры надыходзе страхавога выпадку.

Страхавой кампенсацыяй прызнаецца сума грашовых сродкаў, што выплачваюцца ў лік пакрыцця ўрону пры надыходзе страхавога выпадку па дагавору маёмаснага страхавання.

Па дагавору маёмаснага страхавання страхавая кампенсацыя не можа перавышаць страхавую суму, калі іншае не прадугледжана дагаворам страхавання.

Праваахоўныя і судовыя органы, медыцынскія, метэаралагічныя, ветэрынарныя, камунальныя і іншыя ўстановы і арганізацыі абавязаны прадастаўляць страхавым арганізацыям па іх запытах дакументы і заключэнні, неабходныя для вырашэння пытання аб выплаце страхавых сум і страхавой кампенсацыі.

Сумы, якія выплачваюцца страхавымі арганізацыямі, не падлягаюць абкладанню падаткамі і зборамі. З гэтых сум не спаганяецца дзяржаўная пошліна.

Артыкул 12. Страхавы ўзнос (страхавая прэмія) і страхавы тарыф

Страхавым узносам (страхавой прэміяй) з'яўляецца плата за страхаванне, якую страхавальнік ці іншая асоба ад імя страхавальніка абавязаны ўнесці страхоўшчыку. Размер страхавога ўзносу па добраахвотных відах страхавання вызначаецца пагадненнем бакоў, а па абавязковых відах страхавання — заканадаўствам. Страхавыя ўзносы не абкладаюцца падаткамі. Страхавыя ўзносы па абавязковых відах страхавання, а таксама па страхаванню маёмасці юрыдычных асоб, грузаў і рызыкі непагашэння крэдытаў уключаюцца страхавальнікам у сабекошт прадукцыі (работ, паслуг).

Страхавы тарыф — гэта страхавы ўзнос з адзінкі страхавой сумы за пэўны перыяд страхавання.

Размер страхавога тарыфу па абавязковых відах страхавання вызначаецца заканадаўствам, а па добраахвотных відах страхавання — страхавой арганізацыяй.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь

Артыкул 1. Унутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь

Унутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (далей — унутраныя войскі) — дзяржаўнае ўзброенае фарміраванне, прызначанае для абароны жыцця, здароўя, правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, грамадства і дзяржавы, канстытуцыйнага ладу, бяспекі і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь ад злачынных і іншых проціпраўных замахаў.

Артыкул 2. Задачы ўнутраных войск

Задачамі ўнутраных войск з'яўляюцца:

удзел у ахове грамадскага парадку;

забеспячэнне рэжыму ізаляцыі асоб, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі і заключаны пад варту, і іх канваіраванне;

ахова асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў і спецыяльных грузаў;

удзел у ажыццяўленні рэжыму надзвычайнага становішча;

выкананне задач у сістэме тэрытарыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 3. Прынцыпы дзейнасці ўнутраных войск

Дзейнасць унутраных войск будуецца на прынцыпах законнасці, гуманізму, павагі правоў чалавека і адзінаначалля.

Артыкул 4. Прававая аснова дзейнасці ўнутраных войск

Унутраныя войскі ўваходзяць у сістэму Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. У сваёй дзейнасці яны кіруюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, статутамі баявой службы ўнутраных войск і патрульна-паставой службы міліцыі, агульнавоінскімі статутамі.

Артыкул 5. Арганізацыя ўнутраных войск

Унутраныя войскі складаюцца са злучэнняў і часцей:

міліцыі;

аператыўнага прызначэння;

па ахове папраўча-працоўных устаноў;

па ахове асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў і спецыяльных грузаў;

ваенна-вучэбных устаноў, вучэбных часцей і падраздзяленняў забеспячэння дзейнасці ўнутраных войск.

Кіраўніцтва ўнутранымі войскамі ажыццяўляе міністр унутраных праў Рэспублікі Беларусь, а непасрэднае кіраванне — Камандуючы ўнутранымі войскамі, які па пасадзе з'яўляецца намеснікам міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Для забеспячэння кіравання ўнутранымі войскамі ствараюцца Упраўленне Камандуючага ўнутранымі войскамі і Ваенны Савет унутраных войск, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннямі, што зацвярджаюцца Міністрам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Колькасць унутраных войск вызначаецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь.

Структура, дыслакацыя і размяшчэнне ўнутраных войск вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў забеспячэнні дзейнасці ўнутраных войск

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь:

ажыццяўляе заканадаўчае рэгуляванне арганізацыі і дзейнасці ўнутраных войск, устанаўлівае заканадаўчыя гарантыі прававой і сацыяльнай абароны ваеннаслужачых і членаў іх сем'яў;

вызначае колькасць унутраных войск;

ажыццяўляе кантроль за правамернасцю прыцягнення ўнутраных войск да выканання задач, ускладзеных на іх гэтым Законам;

заканадаўча вызначае агульныя задачы ўнутраных войск у сістэме бяспекі Рэспублікі Беларусь;

прымае рашэнне аб прыцягненні ўнутраных войск для аказання садзейнічання органам унутраных спраў у забеспячэнні прававога рэжыму надзвычайнага становішча.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь:

забяспечвае фінансаванне і выдзяленне матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў для забеспячэння дзейнасці ўнутраных войск;

зацвярджае пералік відаў зброі і боепрыпасаў, баявой і спецыяльнай тэхнікі, спецыяльных сродкаў, якія знаходзяцца на ўзбраенні ўнутраных войск;

вызначае штогадовыя кантынгенты грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія падлягаюць прызыву на ваенную службу і зборы ва ўнутраныя войскі, выдае пастановы аб чарговых прызывах на ваенную службу і аб звальненні ў запас ваеннаслужачых, выслужыўшых устаноўленыя тэрміны службы;

забяспечвае аснашчэнне ўнутраных войск узбраеннем, баявой і спецыяльнай тэхнікай, спецыяльнымі сродкамі;

устанаўлівае заданні па падрыхтоўцы і перадачы ва ўнутраныя войскі сродкаў транспарту, сувязі і іншых відаў матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння пры аб'яўленні мабілізацыі і ў ваенны час, а таксама іншыя мабілізацыйныя заданні;

зацвярджае пералік маршрутаў канваіравання асуджаных і асоб, заключаных пад варту, аб'ектаў і спецыяльных грузаў, што падлягаюць вайсковай ахове, а таксама судоў, у інтарэсах якіх унутраныя войскі выконваюць ускладзеныя на іх абавязкі;

вызначае структуру, дыслакацыю і размяшчэнне ўнутраных войск, уносіць прапановы Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь для вызначэння іх колькасці;

прымае рашэнні аб стварэнні, перапрафіляванні і скасаванні ваенна-вучэбных устаноў унутраных войск, а таксама вызначае парадак падрыхтоўкі ваенных кадраў;

ажыццяўляе мерапрыемствы па сацыяльнай абароне, матэрыяльнаму і бытавому забеспячэнню ваеннаслужачых унутраных войск і членаў іх сем'яў, а таксама ваеннаслужачых, звольненых у запас (адстаўку), і членаў іх сем'яў;

прысвойвае воінскія званні асобам вышэйшага афіцэрскага складу, пазбаўляе званняў і аднаўляе ў гэтых званнях; па прадстаўленню міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь назначае (вызваляе) ваеннаслужачых на воінскія пасады, што падлягаюць замяшчэнню асобамі вышэйшага афіцэрскага складу;

вырашае іншыя пытанні забеспячэння дзейнасці ўнутраных войск, акрамя тых, якія згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і гэтым Законам аднесены да кампетэнцыі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання:

удзельнічаюць у разглядзе прапаноў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь па фарміраванню воінскіх часцей, падраздзяленняў і ўстаноў унутраных войск;

ствараюць унутраным войскам належныя ўмовы для іх дзейнасці, забяспечваюць рэалізацыю гарантый прававой і сацыяльнай абароны ваеннаслужачых унутраных войск і членаў іх сем'яў;

аказваюць камандаванню ўнутраных войск садзейнічанне ў якасным камплектаванні воінскіх фарміраванняў прызыўнікамі;

прадастаўляюць воінскім часцям і падраздзяленням унутраных войск службовыя памяшканні і жылую плошчу, забяспечваюць аказанне камунальна-бытавых і іншых паслуг у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам;

у выпадках, якія не цярпяць прамаруджвання, па ўзгадненню з Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь прыцягваюць асабовы склад воінскіх часцей па месцы іх пастаяннай дыслакацыі для ліквідацыі вынікаў надзвычайных сітуацый;

вырашаюць задачы па забеспячэнню жыццядзейнасці ўнутраных войск, арганізуюць на дагаворнай аснове пастаўку ва ўнутраныя войскі падведамнымі прадпрыемствамі заказной прадукцыі, электраэнергіі, цеплаэнергіі, выдзяляюць для патрэб унутраных войск зямельныя ўчасткі.

Артыкул 7. Камплектаванне ўнутраных войск

Унутраныя войскі камплектуюцца ваеннаслужачымі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе" і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Абавязкі ваеннаслужачых унутраных войск

Ваеннаслужачыя ўнутраных войск, выконваючы ўскладзеныя на іх задачы, абавязаны:

1) удзельнічаць у ахове грамадскага парадку, у тым ліку пры правядзенні масавых грамадска-палітычных, спартыўных і святочных мерапрыемстваў, прымаючы неабходныя меры па абароне здароўя, жыцця, гонару, годнасці, правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян ад проціпраўных замахаў;

2) забяспечваць ахову асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў, спецыяльных грузаў, складаў (баз) Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і воінскіх грузаў пры перавозках;

3) ва ўстаноўленым парадку прымаць удзел у ажыццяўленні рэжыму надзвычайнага становішча;

4) забяспечваць абарону канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

5) ахоўваць папраўча-працоўныя ўстановы, лячэбна-працоўныя прафілакторыі і следчыя ізалятары, ажыццяўляць сіламі падраздзяленняў кантралёраў сумесна з адміністрацыяй нагляд за асуджанымі ў папраўча-працоўных установах і асобамі, якія ўтрымліваюцца ў лячэбна-працоўных прафілакторыях;

6) канваіраваць і ахоўваць асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай;

7) удзельнічаць у ліквідацыі пажараў, вынікаў выбухаў і аварый на аб'ектах, якія ахоўваюцца;

8) адшукваць асоб, якія ўцяклі з-пад аховы і нагляду;

9) спыняць сумесна з адміністрацыяй і міліцыяй групавыя непадпарадкаванні і масавыя беспарадкі ў папраўча-працоўных установах, лячэбна-працоўных прафілакторыях і следчых ізалятарах, абясшкоджваць злачынцаў, якія захапілі заложнікаў у папраўча-працоўных установах;

10) ахоўваць грамадскі парадак, матэрыяльныя каштоўнасці, дзяржаўную і калектыўную ўласнасць, уласнасць грамадзян пры стыхійных бедствах;

11) удзельнічаць у забеспячэнні каранцінных мерапрыемстваў пры ўзнікненні эпідэмій і эпізаотый, заражэнні мясцовасці таксічнымі і радыеактыўнымі рэчывамі;

12) удзельнічаць у затрыманні злачынцаў, якія захапілі паветранае судна або іншыя важныя аб'екты;

13) па рашэнню міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь удзельнічаць у спыненні парушэнняў грамадскага парадку, калі гэтыя парушэнні носяць масавы характар і ўяўляюць пагрозу жыццю і здароўю грамадзян, дэзарганізуюць работу прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, транспарту ці накіраваны на разбурэнне і знішчэнне дзяржаўнай і калектыўнай уласнасці, уласнасці грамадзян;

14) браць пад варту і вызваляць з-пад варты асоб на падставе прыгавору або вызначэння суда;

15) аказваць дапамогу пагранічным войскам у затрыманні парушальнікаў Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь.

Структура і абавязкі ўнутраных войск на ваенны час вызначаюцца заканадаўчымі актамі аб абароне Рэспублікі Беларусь, пастановамі і распараджэннямі Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Унутраныя войскі выконваюць ускладзеныя на іх абавязкі сумесна з адміністрацыяй, аператыўнымі і рэжымнымі органамі аб'ектаў, якія ахоўваюцца, міліцыяй, органамі дзяржаўнай бяспекі, часцямі пагранічных войск і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Не дапускаецца выкарыстанне ўнутраных войск для выканання абавязкаў, не прадугледжаных гэтым Законам.

Артыкул 9. Правы ваеннаслужачых унутраных войск

Ваеннаслужачым унутраных войск у мэтах выканання ўскладзеных на іх задач прадастаўляецца права:

1) затрымліваць, праводзіць нагляд, апытанне і перадаваць у органы міліцыі (дзяржаўнай бяспекі) асоб, якія спрабуюць пранікнуць на аб'екты, што ахоўваюцца, дастаўляюць на гэтыя аб'екты забароненыя прадметы або ўчынілі напад на ахоўваемы аб'ект, а таксама ўцяклі з-пад варты;

2) рабіць вобыск асуджаных у папраўча-працоўных установах і асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, пры канваіраванні, надгляд траспартных сродкаў і грузаў на кантрольна-прапускных пунктах аб'ектаў, што ахоўваюцца, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, праводзіць асабісты надгляд грамадзян і іх рэчаў пры накіраванні праз кантрольна-прапускныя пункты аб'ектаў;

3) праводзіць ачапленне (блакіраванне) раёнаў мясцовасці, асобных будынкаў і аб'ектаў пры вышуку ўцёкшых асуджаных і асоб, якія ўчынілі злачынствы, спыненні групавых парушэнняў грамадскага парадку, масавых беспарадкаў і іншых антыграмадскіх дзеянняў, а таксама пры аварыях, катастрофах, крушэннях, пажарах і стыхійных бедствах;

4) правяраць у асоб пры падазрэнні ва ўчыненні правапарушэнняў дакументы, што засведчваюць іх асобу; пры ахове грамадскага парадку затрымліваць, надглядаць і перадаваць работнікам міліцыі асоб, якія ўчынілі правапарушэнні;

5) бесперашкодна ўваходзіць у памяшканні прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый пры праследаванні асоб, якія ўчынілі злачынствы, а для спынення грамадска небяспечных дзеянняў, што пагражаюць жыццю і здароўю грамадзян, — у жылыя і іншыя памяшканні;

6) у неадкладных выпадках карыстацца бясплатна сродкамі сувязі, што належаць прадпрыемствам, установам і арганізацыям, і выкарыстоўваць пры непасрэдным праследаванні ўцёкшых асуджаных або асоб, якія падазраюцца ва ўчыненні злачынства, і ў іншых выпадках, якія не цярпяць адкладу, сродкі перамяшчэння (акрамя спецыяльных і дыпламатычных аўтамабіляў), што належаць прадпрыемствам, установам і арганізацыям;

7) пры правядзенні вышуковых мерапрыемстваў спыняць з мэтай праверкі транспартныя сродкі і праводзіць іх надгляд;

8) затрымліваць ваеннаслужачых, якія парушаюць грамадскі парадак, і перадаваць іх ваенным камендантам або камандзірам воінскіх часцей;

9) патрабаваць ад грамадзян і службовых асоб захоўвання грамадскага парадку;

10) прымяняць у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Законам, спецыяльныя сродкі і табельную агнястрэльную зброю;

11) перадаваць для часовага размяшчэння і ўтрымання ў следчых ізалятарах, турмах і месцах кароткачасовага ўтрымання затрыманых асоб, якія канваіруюцца на выязныя судовыя пасяджэнні, і затрыманых уцёкшых асуджаных (падсудных).

На ваеннаслужачых унутраных войск пры іх удзеле ў выкананні задач міліцыі распаўсюджваецца прававы статус работніка міліцыі.

Неправамерныя дзеянні ваеннаслужачых унутраных войск могуць быць абскарджаны грамадзянамі ва ўстаноўленым парадку вышэйстаячаму камандзіру (начальніку), пракурору або ў суд.

Артыкул 10. Прымяненне фізічнай сілы

Ваеннаслужачыя ўнутраных войск маюць права прымяніць фізічную сілу, у тым ліку баявыя прыёмы рукапашнага бою, для прадухілення і спынення правапарушэнняў, пераадолення процідзеяння законным патрабаванням, калі ненасільныя спосабы не забяспечваюць выканання ўскладзеных на іх абавязкаў.

Фізічная сіла прымяняецца зыходзячы з абставін, якія складваюцца. Калі гэта магчыма, прымяненню сілы павінна папярэднічаць папярэджанне аб намеры яе выкарыстаць.

Ва ўсіх выпадках, калі пазбегнуць прымянення фізічнай сілы немагчыма, ваеннаслужачыя абавязаны імкнуцца прычыніць найменшую шкоду здароўю, гонару, годнасці і маёмасці грамадзян, а таксама забяспечыць прадастаўленне пацярпеўшаму медыцынскай і іншай дапамогі.

Артыкул 11. Прымяненне спецыяльных сродкаў

Пры выкананні абавязкаў ваеннаслужачыя ўнутраных войск маюць права прымяняць наручнікі, гумавыя палкі, спецыяльныя хімічныя рэчывы, святлогукавыя ўстройствы адцягваючага ўздзеяння, устройствы для адкрыцця памяшканняў і прымусовага спынення транспарту, вадамёты, бронемашыны і іншыя спецыяльныя і транспартныя сродкі, а таксама службовых жывёл для:

1) адбіцця нападу на ваеннаслужачых, грамадзян і асоб, якія выконваюць службовыя абавязкі або грамадскі абавязак па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю;

2) вызвалення заложнікаў;

3) адбіцця нападу на будынкі, памяшканні, збудаванні і транспартныя сродкі незалежна ад іх прыналежнасці ці іх вызвалення;

4) спынення непадпарадкавання або супраціўлення законным патрабаванням ваеннаслужачых і іншых асоб, якія выконваюць службовыя абавязкі або грамадскі абавязак па забеспячэнню грамадскага парадку, прадухіленню і спыненню правапарушэнняў;

5) спынення масавых беспарадкаў і групавых парушэнняў грамадскага парадку, дзеянняў, накіраваных на разбурэнне і знішчэнне дзяржаўнай і калектыўнай уласнасці, уласнасці грамадзян;

6) затрымання і дастаўлення ў органы міліцыі або іншае службовае памяшканне асоб, якія ўчынілі правапарушэнне, а таксама канваіравання і ўтрымання асоб, затрыманых і падвергнутых арышту, заключаных пад варту, калі яны аказваюць непадпарадкаванне або супраціўленне, а таксама ёсць падставы меркаваць, што яны могуць уцячы або прычыніць шкоду навакольным і сабе;

7) затрымання ўзброеных злачынцаў, якія знаходзяцца ў памяшканнях і іншых цяжкадаступных месцах.

Прымяненню сродкаў, указаных у гэтым артыкуле, павінна папярэднічаць папярэджанне аб намеры прымяніць такія сродкі, за выключэннем адбіцця раптоўнага нападу і вызвалення заложнікаў, і прадастаўленне дастатковага часу для спынення правапарушэння.

Від спецыяльнага сродку і інтэнсіўнасць яго прымянення вызначаюцца ваеннаслужачым самастойна з улікам абставін, якія складваюцца, характару правапарушэння і асобы правапарушальніка.

Забараняецца прымяняць спецыяльныя сродкі ў адносінах да жанчын з бачнымі прыметамі цяжарнасці, асоб з несумненнымі прыметамі інваліднасці і малалетніх, акрамя выпадкаў учынення імі ўзброенага нападу або іншых дзеянняў, якія пагражаюць жыццю і здароўю людзей.

Артыкул 12. Прымяненне агнястрэльнай зброі

У мэтах забеспячэння выканання ўскладзеных абавязкаў у надзвычайных сітуацыях, калі іншыя спосабы і сродкі аказаліся неэфектыўнымі, ваеннаслужачым унутраных войск прадастаўляецца права ў якасці крайняй меры прымяняць зброю ў выпадках:

1) абароны грамадзян і самаабароны ад нападу, які пагражае здароўю, ці для прадухілення такога нападу або захопу зброі ваеннаслужачага;

2) вызвалення заложнікаў;

3) адбіцця нападу на аб'екты, якія ахоўваюцца, вартавых, іншых асоб каравула (вайсковага нарада) або каравульнае памяшканне, а таксама пры спыненні спроб пабочных асоб пранікнуць на аб'екты, якія ахоўваюцца;

4) спынення масавых беспарадкаў у папраўча-працоўных установах і следчых ізалятарах, што суправаджаюцца пагромамі, разбурэннямі, падпаламі, забойствамі, захопамі заложнікаў і іншымі проціпраўнымі дзеяннямі;

5) затрымання асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні і аказваюць узброенае супраціўленне;

6) затрымання асоб, якія ўцякаюць з-пад варты, калі іншымі спосабамі і сродкамі затрымаць іх немагчыма;

7) спынення грамадска небяспечных дзеянняў, якія ўяўляюць пагрозу маёмасці людзей, нападу на аб'екты, што суправаджаецца падпаламі, разбурэннямі і спробамі завалодвання агнястрэльнай зброяй;

8) яўнага нападу на асоб, якія знаходзяцца пад вартай.

Забараняецца прымяняць зброю:

1) у напрамку вогненебяспечных і выбухованебяспечных, а таксама тых, што змяшчаюць моцнадзейныя атрутныя рэчывы, складоў (сховішчаў);

2) ў адносінах да жанчын, малалетніх, інвалідаў з яўнымі прыметамі інваліднасці, за выключэннем выпадкаў учынення імі ўзброенага нападу або іншых дзеянняў, якія пагражаюць жыццю і здароўю людзей; у адносінах да грамадзян, якія маюць пры сабе малалетніх дзяцей.

Артыкул 13. Прававая абарона ваеннаслужачых унутраных войск

Ваеннаслужачыя ўнутраных войск пры выкананні службовых абавязкаў з'яўляюцца прадстаўнікамі ўлады і знаходзяцца пад абаронай дзяржавы. Ніхто не мае права ўмешвацца ў іх службовую дзейнасць, за выключэннем органаў і службовых асоб, упаўнаважаных на тое заканадаўчымі актамі.

Законныя патрабаванні ваеннаслужачых унутраных войск пры выкананні імі службовых абавязкаў з'яўляюцца абавязковымі для выканання грамадзянамі, ваеннаслужачымі і службовымі асобамі.

Невыкананне законных патрабаванняў ваеннаслужачых унутраных войск, а таксама іншыя дзеянні, якія перашкаджаюць выкананню ўскладзеных на ўнутраныя войскі абавязкаў, цягнуць устаноўленую законам адказнасць.

Артыкул 14. Фінансаванне ўнутраных войск

Фінансаванне ўнутраных войск робіцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Артыкул 15. Раскватараванне воінскіх часцей

Раскватараванне воінскіх часцей (падраздзяленняў) унутраных войск праводзіцца ў парадку і па нормах, устаноўленых для ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Утрыманне ваенных гарадкоў, будынкаў, збудаванняў, што выдзяляюцца для раскватаравання воінскіх часцей (падраздзяленняў), якія ажыццяўляюць ахову папраўча-працоўных устаноў, лячэбна-працоўных прафілакторыяў, а таксама іншых аб'ектаў, робіцца за кошт сродкаў устаноў (аб'ектаў), што ахоўваюцца.

Артыкул 16. Правы і льготы ваеннаслужачых унутраных войск

Ваеннаслужачыя ўнутраных войск карыстаюцца правамі і льготамі, устаноўленымі заканадаўствам для ваеннаслужачых Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 17. Палітычныя арганізацыі ва ўнутраных войсках

Ва ўнутраных войсках забараняецца стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт.

Артыкул 18. Нагляд і кантроль за выкананнем законнасці ў дзейнасці ўнутраных войск

Нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем законаў у дзейнасці ўнутраных войск ажыццяўляюць Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь і падначаленыя яму пракуроры.

Ведамасны кантроль за рацыянальным выкарыстаннем сіл і сродкаў ва ўнутраных войсках, за адпаведнасцю арганізацыйнай структуры воінскіх фарміраванняў аб'ёму і характару ўскладзеных на іх задач, а таксама законнасцю іх дзейнасці ажыццяўляецца міністрам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

3 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь" з дня яго апублікавання.

2. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

у трохмесячны тэрмін прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь";

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь нарматыўных актаў, якія супярэчаць дадзенаму Закону.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

3 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2342-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь

Гэты Закон гарантуе ў адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнародна-прававымі актамі забеспячэнне права грамадзяніна Рэспублікі Беларусь свабодна пакідаць сваю краіну і вяртацца ў яе; рэгулюе парадак афармлення дакументаў для выезду за мяжу і ўезду ў Рэспубліку Беларусь.

Артыкул 1. Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на выезд з Рэспублікі Беларусь і ўезд у Рэспубліку Беларусь

Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права выязджаць з Рэспублікі Беларусь і ўязджаць у Рэспубліку Беларусь.

Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць пазбаўлены права на ўезд у Рэспубліку Беларусь.

Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць пазбаўлены права на выезд з Рэспублікі Беларусь. Права на выезд грамадзяніна Рэспублікі Беларусь можа быць часова абмежавана ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Недапушчальнасць абмежавання правоў грамадзян, якія выязджаюць з Рэспублікі Беларусь на пастаяннае жыхарства

У адносінах да грамадзян, якія звярнуліся з просьбай аб выездзе з Рэспублікі Беларусь на пастаяннае жыхарства, і членаў іх сем'яў дзейнічаюць усе палажэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь, яны карыстаюцца ўсімі правамі і нясуць устаноўленыя законам абавязкі. Якое-небудзь адвольнае абмежаванне іх грамадзянскіх, працоўных, жыллёвых і іншых правоў не дапускаецца.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь да выезду за мяжу на пастаяннае жыхарства абавязаны выканаць маёмасныя абавязацельствы перад асобамі, на якіх распаўсюджваецца юрысдыкцыя Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія атрымалі выязныя дакументы, маюць права згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на вываз у краіну выезду маёмасці, што належыць ім на праве ўласнасці.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь пры выездзе за мяжу на пастаяннае жыхарства маюць права захоўваць за сабой на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь жыллё і іншую маёмасць, якая належыць ім на праве ўласнасці, акрамя зямлі.

Выплата пенсій грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія выязджаюць з Рэспублікі Беларусь за мяжу на пастаяннае жыхарства, ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія выехалі з Рэспублікі Беларусь на пастаяннае жыхарства, па вяртанні ў Рэспубліку Беларусь на пастаяннае або часовае жыхарства карыстаюцца на агульных падставах усімі правамі, якія гарантуюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і нясуць прадугледжаныя законам абавязкі.

Артыкул 3. Афармленне дакументаў на выезд за мяжу

Выезд за мяжу афармляецца грамадзянам па іх асабістай заяве або па хадайніцтву іх законных прадстаўнікоў упаўнаважанымі на гэта дзяржаўнымі органамі па месцы пастаяннага жыхарства заяўніка.

Заявы аб выездзе за мяжу на пастаяннае жыхарства прымаюцца пры наяўнасці натарыяльна заверанай згоды асоб, якія знаходзяцца на ўтрыманні заяўніка і застаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, а пры наяўнасці непаўналетніх дзяцей, што пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, — таксама іх законнага прадстаўніка ў Рэспубліцы Беларусь пры адсутнасці ў іх патрабаванняў па выплатах аліментных плацяжоў.

У выпадках, калі па якіх-небудзь прычынах згода, прадугледжаная часткай другой гэтага артыкула, не можа быць атрымана, грамадзянін, які выязджае, мае права звярнуцца ў суд, што разглядае пытанне аб наяўнасці або адсутнасці аліментных абавязацельстваў. Па рашэнню суда гэтыя абавязацельствы могуць быць пагашаны аднаразова або ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены абавязацельствы па выплаце аліментаў.

Парадак і правілы афармлення дакументаў на выезд з Рэспублікі Беларусь устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Дакументы для выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць сваё права на выезд з Рэспублікі Беларусь і ўезд у Рэспубліку Беларусь па пашпартах грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Парадак афармлення грамадзянам Рэспублікі Беларусь дыпламатычных і службовых пашпартоў, а таксама пашпарта марака рэгулюецца іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Пашпарты, якія афармлены належным чынам, сапраўдныя для выезду з Рэспублікі Беларусь ва ўсе краіны свету. Парадак уезду грамадзян Рэспублікі Беларусь у замежныя краіны рэгулюецца іх адпаведным заканадаўствам, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія выехалі за мяжу на пастаяннае жыхарства, становяцца на ўлік у консульскай установе Рэспублікі Беларусь за мяжой, аб чым робіцца адзнака ў пашпарце.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой, уязджаюць у Рэспубліку Беларусь на часовае жыхарства па сапраўдных пашпартах грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь вяртаюцца на пастаяннае жыхарства ў Рэспубліку Беларусь па пашпартах грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, у якіх зроблена адзнака аб зняцці іх з уліку ў консульскай установе Рэспублікі Беларусь за мяжой.

Артыкул 5. Падставы для часовых абмежаванняў у праве на выезд з Рэспублікі Беларусь

Выезд за мяжу грамадзяніну Рэспублікі Беларусь можа быць часова абмежаваны:

1) калі ён валодае звесткамі, што складаюць дзяржаўную тайну, — да спынення дзеяння акалічнасцей, якія перашкаджаюць выезду;

2) калі супраць яго ўзбуджана крымінальная справа — да заканчэння вядзення справы;

3) калі ён асуджаны за ўчыненне злачынства — да адбыцця пакарання або вызвалення ад пакарання;

4) калі ён ухіляецца ад выканання абавязацельстваў, накладзеных на яго судом, — да выканання абавязацельстваў;

5) калі да яго прад'яўлены грамадзянскі іск у судзе — да заканчэння вядзення справы;

6) калі ён паведаміў аб сабе заведама ілжывыя звесткі пры афармленні дакументаў;

7) калі ён прыпісаны да прызыўнога ўчастка і падлягае прызыву ў прызначаны час на абавязковую тэрміновую ваенную службу — да праходжання тэрміновай ваеннай службы або да вызвалення ад яе ў адпаведнасці з законам.

Прадпрыемствы, установы і арганізацыі абавязаны прадставіць у месячны тэрмін па запытах дзяржаўных органаў, упаўнаважаных афармляць дакументы на выезд за мяжу, звесткі аб наяўнасці ўказаных у частцы першай гэтага артыкула прычын, якія перашкаджаюць выезду за мяжу.

Пры ўзнікненні ў якой-небудзь краіне надзвычайнай сітуацыі, што стварае немагчымасць бяспечных умоў пражывання грамадзян Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь можа прымаць рашэнні аб абмежаванні выезду ў дадзеную краіну. Гэтыя рашэнні і звесткі аб іх адмене падлягаюць апублікаванню. Указаныя абмежаванні дзейнічаюць да спынення акалічнасцей, што перашкаджаюць выезду.

Адзнака ў пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь аб выездзе за мяжу можа быць анулявана ў выпадках, устаноўленых пунктамі 1—6 часткі першай гэтага артыкула, а таксама пры яе падробцы.

Падставай для адмовы ў афармленні дакументаў грамадзяніну для выезду за мяжу на пастаяннае жыхарства могуць быць выпадкі, прадугледжаныя пунктамі 1—7 часткі першай гэтага артыкула, а для выезду на часовае знаходжанне — пунктамі 1—6 часткі першай гэтага артыкула.

Абмежаванні, указаныя ў пункце 1 часткі першай гэтага артыкула, павінны быць даведзены да ведама грамадзян наймальнікамі, адміністрацыяй навучальных устаноў і камандаваннем воінскіх часцей пры паступленні на работу, вучобу, залічэнні на абавязковую ваенную службу, звязаныя з допускам да звестак, якія складаюць дзяржаўную тайну.

Артыкул 6. Тэрміны разгляду заяў грамадзян і дзеяння афармленых дакументаў на выезд за мяжу

Заява грамадзяніна Рэспублікі Беларусь аб афармленні дакументаў на выезд за мяжу на пастаяннае жыхарства павінна быць разгледжана не пазней трох месяцаў з дня падачы дакументаў, а на часовы выезд — у месячны тэрмін.

Адзнака ў пашпарце аб часовым выездзе з Рэспублікі Беларусь дзейнічае тэрмінам да пяці гадоў, а аб выездзе на пастаяннае жыхарства — на працягу аднаго года. Пасля заканчэння ўказанага ў пашпарце тэрміну выезду за мяжу афармленыя дакументы страчваюць сілу і заява падаецца зноў ва ўстаноўленым гэтым Законам парадку.

Калі паездка за мяжу звязана з тэрміновым лячэннем грамадзяніна, які выязджае, ці з цяжкай хваробай або смерцю блізкага сваяка, што пражывае за мяжой, заява аб афармленні дакументаў на выезд разглядаецца неадкладна, але не пазней чым на працягу трох рабочых дзён. Пры гэтым у пашпарце робіцца адзнака аб выездзе за мяжу тэрмінам да трох месяцаў.

Пісьмовае паведамленне аб адмове ў афармленні дакументаў на выезд за мяжу на падставах, прадугледжаных артыкулам 5 гэтага Закона, накіроўваецца грамадзяніну не пазней чым праз дзесяць дзён пасля прыняцця такога рашэння.

У выпадку адхілення просьбы аб афармленні дакументаў на выезд за мяжу паўторная заява разглядаецца пасля заканчэння шасці месяцаў з дня прыняцця рашэння аб адмове ў праве на выезд. На паўторны разгляд прымаюцца раней прадстаўленыя дакументы, калі ўказаныя ў іх даныя засталіся без змяненняў.

Артыкул 7. Парадак абскарджання часовага абмежавання права на выезд за мяжу

Часовае абмежаванне права на выезд за мяжу можа быць абскарджана грамадзянінам у вышэйстаячы дзяржаўны орган, упаўнаважаны разглядаць заявы і скаргі грамадзян аб выездзе за мяжу, або ў суд.

Часовае абмежаванне права на выезд за мяжу, прадугледжанае пунктамі 2 і 3 часткі першай артыкула 5 гэтага Закона, абскарджанню не падлягае.

Артыкул 8. Дзяржаўная пошліна за афармленне дакументаў на выезд за мяжу

За афармленне дакументаў на выезд за мяжу збіраецца дзяржаўная пошліна ў памерах і парадку, якія ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У выпадку часовага абмежавання права на выезд за мяжу заплачаная пошліна падлягае вяртанню. Пры страце (крадзяжы), прывядзенні ў непрыгоднасць пашпартоў, якія афармлены на выезд за мяжу, хадайніцтва аднаўляецца з выплатай дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленым памеры.

Артыкул 9. Выезд з Рэспублікі Беларусь непаўналетніх

Грамадзяне, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, могуць выязджаць з Рэспублікі Беларусь па натарыяльна заверанаму хадайніцтву законных прадстаўнікоў або ў іх суправаджэнні. Пры адсутнасці згоды аднаго з бацькоў выезд непаўналетняга можа быць дазволены на падставе рашэння суда.

Выезд за мяжу на пастаяннае жыхарства дзяцей ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў можа быць здзейснены пры наяўнасці іх згоды, выкладзенай у пісьмовай форме і натарыяльна засведчанай.

Артыкул 10. Выезд з Рэспублікі Беларусь недзеяздольных

Грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, маюць права выязджаць за мяжу толькі ў суправаджэнні сваіх законных прадстаўнікоў.

Артыкул 11. Прымяненне міжнародных дагавораў

Калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, што ёсць у гэтым Законе, прымяняюцца правілы міжнародных дагавораў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

2 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь" з 1 студзеня 1994 года.

2. Устанавіць, што на перыяд да атрымання грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь пры выездзе за мяжу яны карыстаюцца замежнымі пашпартамі грамадзяніна СССР з адзнакай аб прыналежнасці да грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

3. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 снежня 1993 года:

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні дзеючых заканадаўчых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прывесці ў адпаведнасць з дадзеным Законам рашэнні ўрада Рэспублікі Беларусь;

зацвердзіць у адпаведнасці з гэтым Законам парадак і правілы афармлення дакументаў на выезд за мяжу грамадзянам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку ваеннаслужачым, супрацоўнікам Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, а таксама правілы афармлення дыпламатычных, службовых пашпартоў і пашпарта марака;

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі нарматыўных актаў, якія супярэчаць дадзенаму Закону;

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб стварэнні Дзяржаўнай эміграцыйна-іміграцыйнай службы.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

2 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2336-XII

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб страхаванні

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Артыкул 13. Састрахаванне

Аб'ект страхавання можа быць застрахаваны сумесна некалькімі страхоўшчыкамі (састрахаванне). Пры састрахаванні правы і абавязкі размяркоўваюцца паміж страхоўшчыкамі ва ўзгодненых долях.

Для сумеснага страхавання буйных рызык састрахоўшчыкі могуць ствараць на аснове пагадненняў простыя таварыствы (страхавыя пулы).

Пры наяўнасці адпаведнага пагаднення паміж састрахоўшчыкамі адзін з іх можа прадстаўляць усіх састрахоўшчыкаў ва ўзаемаадносінах са страхавальнікам, застаючыся адказным перад апошнім толькі ў сваёй долі.

Артыкул 14. Перастрахаванне

Перастрахаваннем з'яўляецца перадача страхоўшчыкам на пэўных умовах часткі сваёй адказнасці перад страхавальнікам іншаму страхоўшчыку (перастрахоўшчыку).

Страхавая арганізацыя, якая не пакрывае прынятыя па дагаворах страхавання абавязацельствы за кошт уласных сродкаў і рэзерваў, абавязана забяспечыць выкананне абавязацельстваў шляхам іх перастрахавання.

Перастрахаванне рызык магчыма як у страхоўшчыкаў (перастрахоўшчыкаў) Рэспублікі Беларусь, так і замежных.

Страхоўшчыкі, якія дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць права на прыём рызык у перастрахаванне па тых відах страхавання, на якія імі атрымана ліцэнзія.

Страхоўшчык, які перадаў рызыку ў перастрахаванне, застаецца адказным перад страхавальнікам у поўным аб'ёме.

Адносіны паміж страхоўшчыкам і перастрахоўшчыкам рэгулююцца дагаворам.

Дзейнасць спецыялізаваных перастраховачных арганізацый рэспублікі з'яўляецца прадметам рэгулявання органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

ГЛАВА II. ДАГАВОР СТРАХАВАННЯ

Артыкул 15. Паняцце дагавора страхавання

Па дагавору страхавання адзін бок (страхоўшчык) абавязваецца пры надыходзе страхавога выпадку выплаціць страхавую кампенсацыю або страхавую суму страхавальніку або іншай асобе, правамоцнай на яе атрыманне, а другі бок абавязваецца выплачваць страхавыя ўзносы ва ўстаноўленыя тэрміны і выконваць іншыя ўмовы дагавора.

Артыкул 16. Форма дагавора страхавання

Дагавор страхавання заключаецца ў пісьмовай форме шляхам выдачы страхоўшчыкам страхавога пасведчання (страхавога поліса). Страхавое пасведчанне (страхавы поліс) павінна выраблівацца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да каштоўных папер.

Артыкул 17. Істотныя ўмовы дагавора страхавання

Істотнымі ўмовамі дагавора страхавання прызнаюцца: аб'ект страхавання, размер страхавой сумы, страхавых узносаў і тэрміны іх выплаты, пералік страхавых выпадкаў, тэрмін страхавання, пачатак і заканчэнне дзеяння дагавора страхавання.

Артыкул 18. Момант уступлення дагавора страхавання ў сілу

Дагавор страхавання ўступае ў сілу з моманту выплаты першапачатковага страхавога ўзносу, калі пагадненнем бакоў або заканадаўствам не прадугледжана іншае.

Артыкул 19. Дагавор страхавання аб'екта, звязанага з асабістым немаёмасным інтарэсам

Па дагавору страхавання аб'екта, звязанага з асабістым немаёмасным інтарэсам, страхоўшчык абавязваецца пры надыходзе страхавога выпадку выплаціць страхавальніку або асобе, на карысць якой заключаны дагавор, абумоўленую страхавую суму (частку страхавой сумы) незалежна ад сум, што належаць ім па сацыяльнаму страхаванню, сацыяльнаму забеспячэнню і ў парадку пакрыцця шкоды, а страхавальнік ці асоба, якая заключыла дагавор ад імя страхавальніка, абавязваецца ўносіць устаноўленыя дагаворам страхавыя ўзносы.

Страхавальнік пры заключэнні такога дагавора страхавання мае права назначыць любую асобу для атрымання страхавой сумы на выпадак сваёй смерці. Атрыманая гэтай асобай страхавая сума ў склад спадчыннай маёмасці не ўваходзіць.

Тэрмін дзеяння дагавора страхавання жыцця і пенсій не можа быць менш трох гадоў.

Артыкул 20. Дагавор страхавання аб'екта, звязанага з маёмасным інтарэсам

Па дагавору страхавання аб'екта, звязанага з маёмасным інтарэсам, страхоўшчык абавязваецца за абумоўленую плату (страхавыя ўзносы) пры надыходзе ўказанага ў дагаворы страхавога выпадку пакрыць поўнасцю або часткова страхавальніку або асобе, на карысць якой заключаны дагавор, панесеныя страты, а таксама пакрыць неабходныя расходы, зробленыя ў мэтах змяншэння ўрону, што падлягае пакрыццю, у межах страхавой сумы.

Страхавальнік пасля страхавога выпадку можа, калі гэта прадугледжана заканадаўствам або дагаворам, заявіць страхоўшчыку аб адмове ад маёмасці, з якой звязаны страхавы інтарэс, і атрымаць поўную суму страхавой кампенсацыі.

Артыкул 21. Адмова ў выплаце страхавой сумы або страхавой кампенсацыі

Не падлягае выплаце страхавальніку страхавая сума або страхавая кампенсацыя, калі страхавы выпадак адбыўся ў выніку:

наўмысных дзеянняў страхавальніка або асобы, на карысць якой заключаны дагавор страхавання, накіраваных на надыход страхавога выпадку, выключаючы дзеянні, учыненыя ў стане крайняй неабходнасці або неабходнай абароны;

усякага роду ваенных дзеянняў, ваенных мерапрыемстваў і іх вынікаў, грамадзянскай вайны, народных хваляванняў і забастовак, канфіскацый, рэквізіцый, арышту, знішчэння або пашкоджання маёмасці па распараджэнню ваенных або грамадзянскіх улад;

прамога або ўскоснага ўздзеяння атамнага выбуху, радыяцыі і радыеактыўнага заражэння, звязанага з любым прымяненнем атамнай энергіі або выкарыстаннем расшчапляючых матэрыялаў;

увядзення ў дзеянне законаў (падзаконных актаў), прынятых пасля заключэння дагавора страхавання.

Страхоўшчык таксама мае права адмовіць у выплаце страхавой сумы або страхавой кампенсацыі, калі страхавальнік:

паведаміў страхоўшчыку заведама ілжывыя звесткі або не паведаміў вядомых яму звестак і ўтоеныя такім чынам акалічнасці знаходзяцца ў прычыннай сувязі з надыходам страхавога выпадку;

не паведаміў своечасова, маючы да таго магчымасць, страхоўшчыку аб надыходзе страхавога выпадку або стварыў перашкоды страхоўшчыку ў вызначэнні акалічнасцей, характару і размеру ўрону;

не прыняў магчымых мер для прадухілення і скарачэння ўрону, што прывяло да ўзнікнення страхавога выпадку або павелічэння размеру ўрону;

допусціў грубую ніядбайнасць, а таксама парушэнне правіл процілажарнай бяспекі, правіл захоўвання і перавозкі вогненебяспечных і выбухованебяспечных рэчываў і прадметаў.

Рашэнне аб адмове ў выплаце страхавой сумы прымаецца страхоўшчыкам і паведамляецца страхавальніку ў пісьмовай форме з матывацыяй прычыны адмовы.

Артыкул 22. Пераход правоў і абавязкаў па дагавору страхавання

У выпадку смерці страхавальніка, які заключыў дагавор страхавання маёмасці, яго правы і абавязкі пераходзяць да асобы, якая прыняла гэту маёмасць у парадку атрымання ў спадчыну.

У выпадку смерці страхавальніка, які заключыў дагавор асабістага страхавання на карысць трэціх асоб, яго правы і абавязкі пераходзяць да гэтых асоб. Калі трэція асобы з'яўляюцца недзеяздольнымі, то выкананне дзеянняў па такому дагавору страхавання ўскладаецца на апекуна або папячыцеля.

У выпадках пераходу застрахаванай маёмасці да іншага ўласніка правы і абавязкі страхавальніка пераходзяць да новага ўласніка са згоды страхоўшчыка.

Артыкул 23. Вынікі страты страхавальнікам правоў юрыдычнай асобы або дзеяздольнасці

У выпадку страты страхавальнікам у перыяд дзеяння дагавора страхавання правоў юрыдычнай асобы з прычыны рэарганізацыі або ліквідацыі правы і абавязкі па дагавору добраахвотнага страхавання пераходзяць да яго праваперайемніка пры згодзе страхавой арганізацыі.

Калі ў перыяд дзеяння дагавора страхавання страхавальнік прызнаны судом недзеяздольным або абмежаваным у дзеяздольнасці, правы і абавязкі такога страхавальніка пераходзяць да яго апекуна або папячыцеля. Пры гэтым страхаванне грамадзянскай адказнасці заканчваецца з моманту спынення або абмежавання дзеяздольнасці страхавальніка.

Артыкул 24. Спыненне дагавора страхавання

Дагавор страхавання спыняецца ў выпадках:

1) заканчэння тэрміну дзеяння;

2) выканання страхоўшчыкам абавязацельстваў па дагавору ў поўным аб'ёме;

3) нявыплаты страхавальнікам страхавых узносаў ва ўстаноўленыя дагаворам тэрміны;

4) спынення дзейнасці страхавальніка — юрыдычнай асобы або смерці страхавальніка — грамадзяніна, акрамя выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 22 і 23 гэтага Закона.

Дагавор страхавання можа быць спынены датэрмінова па патрабаванню страхавальніка або страхоўшчыка, калі гэта прадугледжана ўмовамі страхавання.

У выпадку датэрміновага спынення дагавора страхавання па патрабаванню страхавальніка страхоўшчык вяртае яму страхавыя ўзносы за незакончаны тэрмін дагавора за вылікам панесеных расходаў. Калі патрабаванне страхавальніка абумоўлена парушэннем страхоўшчыкам правіл страхавання, то апошні вяртае страхавальніку ўнесеныя ім страхавыя ўзносы поўнасцю.

Пры датэрміновым спыненні дагавора страхавання па патрабаванню страхоўшчыка ён вяртае страхавальніку ўнесеныя ім страхавыя ўзносы поўнасцю. Калі патрабаванне страхоўшчыка абумоўлена невыкананнем страхавальнікам правіл страхавання, то ён вяртае страхавальніку страхавыя ўзносы за незакончаны тэрмін дагавора за вылікам панесеных расходаў.

Артыкул 25. Несапраўднасць дагавора страхавання

Дагавор страхавання лічыцца несапраўдным, калі ён заключаны:

на ўмовах, што супярэчаць гэтаму Закону, а таксама пагаршаюць становішча страхавальніка ў параўнанні з дзеючым заканадаўствам;

з асобамі, якія не валодаюць грамадзянскай дзеяздольнасцю або абмежаваны ў дзеяздольнасці судом, а таксама з арганізацыйнымі структурамі, якія не надзелены правамі юрыдычнай асобы;

з асобай, якая знаходзілася ў момант заключэння дагавора ў стане, калі яна не магла разумець значэнне сваіх дзеянняў;

у адносінах да маёмасці, якая здабыта злачынным шляхам, падвергнута вопісу ці арышту або падлягае канфіскацыі на падставе ўступіўшага ў законную сілу прыгавору суда або вынесенай у адпаведнасці з Законам пастановы аб канфіскацыі маёмасці;

пасля выпадку, з надыходам якога дагавор страхавання прадугледжвае выплату страхавой сумы (страхавой кампенсацыі);

асобай, неправамоцнай заключаць дагавор ад імя страхоўшчыка;

у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Па несапраўдных дагаворах страхоўшчык вяртае страхавальніку страхавыя ўзносы, атрыманыя па дагавору страхавання, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 26. Умовы заключэння новага дагавора страхавання аднаго і таго ж аб'екта

Страхавальнік мае права заключыць дагавор страхавання аднаго і таго ж аб'екта з новымі страхоўшчыкамі пры ўмове паведамлення ім аб тым, што аб'ект ужо застрахаваны.

Невыкананне ўказанага правіла цягне несапраўднасць новага дагавора страхавання.

Артыкул 27. Права патрабавання страхоўшчыка да асобы, адказнай за прычынены ўрон

Да страхоўшчыка, які выплаціў страхавую кампенсацыю па маёмаснаму страхаванню, пераходзіць права патрабавання (у межах гэтай сумы), што мелі страхавальнік або асоба, якая атрымала страхавую кампенсацыю, да асобы, адказнай за прычынены ўрон.

Калі страхавальнік адмаўляецца ад прэтэнзій да ўказанай асобы або ад правоў, што забяспечваюць выкананне гэтых патрабаванняў, то страхоўшчык вызваляецца ад выплаты той часткі страхавой кампенсацыі, якую яму прыйшлося б спаганяць з трэціх асоб.

Артыкул 28. Адказнасць страхавой арганізацыі

За несвоечасовую выплату страхавой сумы (страхавой кампенсацыі) па віне страхавой арганізацыі павінна выплачвацца страхавальніку пеня за кожны дзень пратэрміноўкі ў размеры, што вызначаецца органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

ГЛАВА III. ГАСПАДАРЧАЯ І ФІНАНСАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТРАХОЎШЧЫКАЎ

Артыкул 29. Умовы забеспячэння фінансавай устойлівасці страхоўшчыкаў

Асновай фінансавай устойлівасці страхоўшчыкаў з'яўляецца наяўнасць у іх аплачанага статутнага фонду і страхавых рэзерваў, а таксама сістэмы перастрахавання.

Артыкул 30. Дзейнасць страхавых і перастраховачных арганізацый

Страхавыя і перастраховачныя арганізацыі акрамя страхавой дзейнасці ў мэтах атрымання дадатковых даходаў для прадастаўлення льгот страхавальнікам, умацавання ўстойлівасці страхавання, забеспячэння гарантый па выкананню абавязацельстваў маюць права займацца інвестыцыйнай дзейнасцю, ажыццяўляць крэдытныя аперацыі пасля атрымання ліцэнзіі ад Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, прымаць удзел у стварэнні акцыянерных таварыстваў, асацыяцый, сумесных прадпрыемстваў, у тым ліку з удзелам замежнага капіталу, а таксама займацца іншай дзейнасцю, звязанай са страхаваннем.

Артыкул 31. Прыбытак страхавых і перастраховачных арганізацый

Асноўным абагульняючым паказчыкам вынікаў гаспадарчай дзейнасці страхавой і перастраховачнай арганізацый з'яўляецца прыбытак, які вызначаецца як розніца паміж даходамі, атрыманымі ад страхавой, інвестыцыйнай і іншай дзейнасці, і расходамі на выплату страхавых сум, страхавой кампенсацыі, на вядзенне справы, адлічэннямі ў рэзервы і фонд папераджальных мерапрыемстваў.

Артыкул 32. Рэзервы страхавых і перастраховачных арганізацый

Для забеспячэння абароны страхавальнікаў страхавыя і перастраховачныя арганізацыі ўтвараюць са сваіх даходаў (да вызначэння падаткаабкладаемай базы) наступныя страхавыя рэзервы:

рэзерв па маёмаснаму страхаванню і страхаванню ад няшчасных выпадкаў у размеры, які вызначаецца страхавой арганізацыяй па ўзгадненню з органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю;

рэзерв па страхаванню жыцця, пенсій і медыцынскаму страхаванню ў размеры, які вызначаецца страхавой арганізацыяй па ўзгадненню з органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Страхоўшчыкі і перастрахоўшчыкі, якія ажыццяўляюць страхавую дзейнасць у свабодна канверсуемай валюце, утвараюць рэзервы ў адпаведнай валюце.

Разлік рэзерваў праводзіцца адзін раз па выніках года.

Страхавыя і перастраховачныя арганізацыі маюць права інвесціраваць або іншым чынам размяшчаць страхавыя рэзервы ў межах, што вызначаюцца органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Артыкул 33. Фонд папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў

Для засцярогі маёмасці страхавальнікаў ад разбуральнага дзеяння стыхійных сіл прыроды і ад няшчасных выпадкаў страхавая арганізацыя, якая праводзіць аперацыі па абавязковаму страхаванню, утварае са сваіх даходаў па гэтых відах страхавання (да вызначэння падаткаабкладаемай базы) фонд папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў.

Фонд папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў мае строга мэтавае прызначэнне і выкарыстоўваецца для фінансавання канкрэтных мерапрыемстваў па папярэджанню і барацьбе з пажарамі, падзяжом жывёлы, гібеллю і пашкоджаннем сельскагаспадарчых культур, папярэджанню дарожна-транспартных здарэнняў.

Размер адлічэнняў у фонд папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў і парадак выкарыстання дадзенага фонду вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 34. Падаткаабкладанне прыбытку страхавых і перастраховачных арганізацый

Прыбытак страхавых і перастраховачных арганізацый падлягае падаткаабкладанню ў парадку і на ўмовах, што вызначаюцца спецыяльнымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 35. Выкарыстанне чыстага прыбытку страхавой і перастраховачнай арганізацыямі

Страхавая і перастраховачная арганізацыі ствараюць рэзервовы фонд з чыстага прыбытку (прыбытку, які застаецца пасля выплаты падаткаў і іншых плацяжоў у бюджэт) шляхам штогадовых адлічэнняў у яго не менш 5 працэнтаў прыбытку да дасягнення не менш 15 працэнтаў статутнага фонду. Астатняя частка чыстага прыбытку выкарыстоўваецца ў адпаведнасці са статутам страхавой або перастраховачнай арганізацыі.

Артыкул 36. Гарантыі плацежаздольнасці страхавой арганізацыі

Для забеспячэння сваёй плацежаздольнасці страхавая арганізацыя абавязана захоўваць суадносіны паміж актывамі і прынятымі страхавымі абавязацельствамі. Методыка разліку гэтых суадносін і іх нарматыўныя размеры ўстанаўліваюцца органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Страхоўшчыкі, якія прынялі абавязацельствы ў аб'ёмах, што перавышаюць магчымасці іх выканання за кошт уласных сродкаў і страхавых рэзерваў, абавязаны застрахаваць у перастрахоўшчыкаў рызыку выканання адпаведных абавязацельстваў.

Страхавыя рэзервы, якія ўтвараюцца страхоўшчыкам, не падлягаюць адабранню дзяржавай.

Размяшчэнне страхавых рэзерваў павінна ажыццяўляцца страхоўшчыкам на ўмовах дыверсіфікацыі, зваротнасці, прыбытковасці і ліквіднасці.

Артыкул 37. Правілы бухгалтарскага ўліку ў страхавых і перастраховачных арганізацыях

Бухгалтарскі ўлік у страхавых і перастраховачных арганізацыях ажыццяўляецца ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю. Фінансавыя вынікі (прыбытак) вызначаюцца па выніках каляндарнага года.

Аперацыі па страхаванню жыцця, пенсій і медыцынскаму страхаванню ўлічваюцца страхоўшчыкам асобна ад аперацый па іншых відах страхавання.

Орган дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю вызначае для страхавых і перастраховачных арганізацый аб'ёмы і тэрміны прадстаўлення бухгалтарскай і статыстычнай справаздачнасці, неабходнай для выканання ім кантрольных функцый.

Артыкул 38. Публікацыя страхавымі і перастраховачнымі арганізацыямі гадавых балансаў

Страхавыя і перастраховачныя арганізацыі публікуюць гадавы баланс па форме і ў тэрміны, якія ўстанаўліваюцца органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю, пасля пацвярджэння аўдытарскай арганізацыяй дакладнасці ўказаных у ім звестак.

ГЛАВА IV. ДЗЯРЖАЎНЫ НАГЛЯД ЗА СТРАХАВОЙ ДЗЕЙНАСЦЮ

Артыкул 39. Дзяржаўны нагляд за страхавой дзейнасцю

Дзяржаўны нагляд за страхавой дзейнасцю ажыццяўляецца органам, спецыяльна ўпаўнаважаным на гэта Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 40. Асноўныя функцыі органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю

Асноўнымі функцыямі органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю з'яўляюцца:

рэгістрацыя страхавых і перастраховачных арганізацый, прадстаўніцтваў, філіялаў, аддзяленняў і іншых адасобленых падраздзяленняў страхавых і перастраховачных арганізацый Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць дзейнасць на яе тэрыторыі, і вядзенне дзяржаўнага рэестра страхавых і перастраховачных арганізацый;

выдача страхавым, перастраховачным арганізацыям і страхавым брокерам ліцэнзій на кожны від страхавой дзейнасці;

кантроль за выкананнем страхавымі, перастраховачнымі арганізацыямі і страхавымі брокерамі патрабаванняў заканадаўства аб страхаванні;

забеспячэнне аднастайнага вядзення страхавымі і перастраховачнымі арганізацыямі ўліку і складання справаздачнасці, фарміравання рэзерваў і вызначэння страхавых тарыфаў;

распрацоўка метадычных і нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць страхавых і перастраховачных арганізацый, у межах сваёй кампетэнцыі;

абагульненне страхавой практыкі, дача страхавым і перастраховачным арганізацыям растлумачэнняў па пытаннях прымянення страхавога заканадаўства і распрацоўка прапаноў па яго ўдасканаленню;

прадстаўленне Рэспублікі Беларусь ва ўсіх арганізацыях па пытаннях страхавой палітыкі;

рэгуляванне знешнеэканамічнай страхавой дзейнасці;

кантроль за выкананнем страхавымі і перастраховачнымі арганізацыямі заканадаўства аб аплаце працы.

Артыкул 41. Правы органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю

Орган дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю мае права:

праводзіць праверкі выканання страхавымі і перастраховачнымі арганізацыямі патрабаванняў заканадаўства аб страхаванні, а таксама адпаведнасці аб'ёму грашовых сродкаў аб'ёму прынятых імі абавязацельстваў і даваць страхавым і перастраховачным арганізацыям абавязковыя для выканання прадпісанні аб устараненні парушэнняў заканадаўства аб страхаванні, аб прывядзенні аб'ёму грашовых сродкаў у адпаведнасць з аб'ёмам прынятых абавязацельстваў;

прымяняць да страхавых, перастраховачных арганізацый і страхавых пасрэднікаў санкцыі за парушэнне заканадаўства аб страхаванні ў парадку і размерах, якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

прыпыняць дзеянне выдадзеных ліцэнзій да ўстаранення выяўленых парушэнняў на пэўны тэрмін, або даваць указанні аб устараненні парушэнняў, не прыпыняючы дзеянне ліцэнзій, або прымаць рашэнні аб іх адкліканні. Пры паўторным або грубым парушэнні парадку ажыццяўлення страхавой або перастраховачнай дзейнасці, на якую выдадзена ліцэнзія, можа яе ануляваць;

даваць прадпісанні ўладальнікам страхавой або перастраховачнай арганізацыі ці ставіць пытанне перад адпаведным дзяржаўным органам аб правядзенні мерапрыемстваў па фінансаваму аздараўленню страхавой або перастраховачнай арганізацыі, аб замене кіраўніцтва страхавой або перастраховачнай арганізацыі, аб ліквідацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі ў выпадку сістэматычнага парушэння заканадаўства аб страхаванні, невыканання яго прадпісанняў, узнікнення становішча, якое пагражае інтарэсам страхавальнікаў;

прымаць рашэнне аб прымусовай ліквідацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі ў выпадку затрымання пачатку дзейнасці больш чым на шэсць месяцаў з моманту рэгістрацыі;

звяртацца ў судовыя органы для разгляду пытання аб банкруцтве страхавых арганізацый, якія не забяспечваюць свае абавязацельствы па выплаце страхавых сум і страхавой кампенсацыі;

прыпыняць аперацыі страхавых і перастраховачных арганізацый па разліковых і іншых рахунках у банках і іншых фінансава-крэдытных установах у выпадках іх дзейнасці без рэгістрацыі ці адпаведнай ліцэнзіі або сістэматычнага парушэння страхавой або перастраховачнай арганізацыяй патрабаванняў дзеючага страхавога заканадаўства, невыканання яго прадпісанняў, ажыццяўлення забароненых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь аперацый ці аперацый, якія выходзяць за межы правоў страхавой або перастраховачнай арганізацыі;

браць са страхавых і перастраховачных арганізацый, іх адасобленых структурных падраздзяленняў і брокераў плату за рэгістрацыю і выдачу ім ліцэнзій на ажыццяўленне страхавой дзейнасці ў размерах, устаноўленых заканадаўствам;

атрымліваць ад страхавых і перастраховачных арганізацый устаноўленую справаздачнасць па страхавых і перастраховачных аперацыях, даведкі і іншую інфармацыю аб іх фінансава-эканамічнай дзейнасці, а таксама звяртацца за атрыманнем такой інфармацыі ў крэдытныя ўстановы, арганізацыі і да грамадзян;

прымаць удзел у экспертызе навучальных праграм па страхаванню ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, праграм спецыялізаваных арганізацый па падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі кадраў для страхавых і перастраховачных арганізацый.

Артыкул 42. Рэгістрацыя страхавых і перастраховачных арганізацый

Страхавыя і перастраховачныя арганізацыі, уключаючы арганізацыі з удзелам замежных інвестараў у Рэспубліцы Беларусь, падлягаюць абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі ў органе дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Для дзяржаўнай рэгістрацыі страхавой і перастраховачнай арганізацый у органе дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю павінна быць прадстаўлена заява, складзеная па ўстаноўленай форме, з прыкладаннем наступных дакументаў:

рашэння заснавальнікаў аб стварэнні страхавой або перастраховачнай арганізацыі;

натарыяльна завераных копій устаноўчых дакументаў;

дакумента крэдытнай установы, які пацвярджае поўную аплату (да рэгістрацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі) статутнага фонду ў размеры, устаноўленым артыкулам 6 гэтага Закона;

звестак аб прафесіянальнай прыгоднасці двух вышэйшых кіраўнікоў і галоўнага бухгалтара страхавой або перастраховачнай арганізацыі;

копіі плацежнага даручэння, якое пацвярджае ўнясенне платы за рэгістрацыю;

дакумента, што пацвярджае законнасць паходжання грашовых сродкаў у фізічных асоб, якія выступаюць у якасці заснавальнікаў;

іншых дакументаў, якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Орган дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю прысвойвае страхавой або перастраховачнай арганізацыі рэгістрацыйны нумар, уключае яе ў рэестр і выдае пасведчанне аб рэгістрацыі.

Дзяржаўная рэгістрацыя ажыццяўляецца не пазней 30 дзён з даты атрымання рэгіструючым органам заявы з усімі неабходнымі дакументамі.

Адмова ў рэгістрацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі можа адбыцца па матывах:

парушэння ўстаноўленага парадку стварэння страхавой або перастраховачнай арганізацыі;

неадпаведнасці яе ўстаноўчых дакументаў патрабаванням заканадаўства;

адсутнасці або незаконнага паходжання ўласных фінансавых рэсурсаў інвестараў для ўнясення ў статутны фонд страхавой або перастраховачнай арганізацыі (па заключэнню аўдытарскай арганізацыі або фінансавых органаў);

прафесіянальнай непрыгоднасці (па заключэнню камісіі органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю) двух вышэйшых кіраўнікоў і галоўнага бухгалтара страхавой або перастраховачнай арганізацыі;

недакладнасці прадстаўленай інфармацыі.

Адмова ў рэгістрацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі па матывах немэтазгоднасці яе стварэння не дапускаецца.

Калі ў рэгістрацыі страхавой або перастраховачнай арганізацыі адмоўлена па матывах, прызнаных яе заснавальнікамі неабгрунтаванымі, яны могуць звярнуцца ў суд.

Любыя змяненні ва ўстаноўчых дакументах падлягаюць абавязковай рэгістрацыі з унясеннем неабходных змяненняў у рэестр рэгістрацыі са збіраннем платы ў размеры, што ўстанаўліваецца заканадаўствам.

Замена кіраўнікоў страхавых і перастраховачных арганізацый пасля рэгістрацыі апошніх праводзіцца па ўзгадненню з органам дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Дзейнасць не зарэгістраваных у органе дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю страхавой і перастраховачнай арганізацый забараняецца. Даходы, атрыманыя ад дзейнасці незарэгістраваных страхавой і перастраховачнай арганізацый, падлягаюць адабранню ў дзяржаўны бюджэт.

Рэгістрацыя прадстаўніцтваў, філіялаў, аддзяленняў і іншых адасобленых падраздзяленняў страхавых і перастраховачных арганізацый Рэспублікі Беларусь праводзіцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Адкрыццё за межамі Рэспублікі Беларусь філіялаў і прадстаўніцтваў, даччыных страхавых і перастраховачных арганізацый і страхавых або перастраховачных арганізацый з удзелам беларускага капіталу ажыццяўляецца з дазволу органа дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

Артыкул 43. Ліцэнзаванне страхавой дзейнасці

Страхавая, перастраховачная арганізацыя або страхавы брокер набываюць права на ажыццяўленне страхавой дзейнасці з моманту атрымання адпаведнай ліцэнзіі.

На кожны від добраахвотнага і абавязковага страхавання выдаецца асобная ліцэнзія, а таксама на перастрахаванне, калі прадметам дзейнасці страхоўшчыка з'яўляецца выключна перастрахаванне.

Выдача ліцэнзій праводзіцца на падставе заявы страхавой, перастраховачнай арганізацыі або страхавога брокера, складзенай па ўстаноўленай форме, з прыкладаннем наступных дакументаў:

плана развіцця страхавых аперацый;

правіл або ўмоў страхавання або перастрахавання;

узораў дакументаў, якія будуць прымяняцца пры правядзенні страхавання;

эканамічнага абгрунтавання дзейнасці, якое ўключае ацэнку прыбытку і страт, праграму перастраховачнай абароны або іншых гарантый забеспячэння абавязацельстваў;

копіі плацежнага даручэння, якое пацвярджае ўнясенне платы за выдачу ліцэнзіі.

Орган дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю разглядае заяву страхавой, перастраховачнай арганізацыі або страхавога брокера аб выдачы ім ліцэнзіі на працягу 30 дзён з моманту атрымання ўсіх прадугледжаных гэтым Законам дакументаў. Пры неабходнасці правядзення экспертнай ацэнкі дзейнасці страхавой або перастраховачнай арганізацыі канчатковае рашэнне прымаецца ў 15-дзённы тэрмін пасля атрымання экспертнага заключэння, але не пазней 60 дзён з моманту атрымання прадугледжаных дакументаў.

Адмова ў выдачы ліцэнзіі можа быць абскарджана ў судовым парадку.

Страхавыя і перастраховачныя арганізацыі, якія не атрымалі ва ўстаноўленым парадку ліцэнзію, правам страхавой дзейнасці не валодаюць.

ГЛАВА V. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 44. Міжнародныя дагаворы

Калі міжнародным дагаворам, у якім удзельнічае Рэспубліка Беларусь, устаноўлена іншае палажэнне, чым тое, якое змяшчаецца ў гэтым Законе, то прымяняецца палажэнне міжнароднага дагавора.

Артыкул 45. Разгляд спрэчак

Спрэчкі, якія вынікаюць з адносін па страхаванню і дзяржаўнаму рэгуляванню страхавой дзейнасці, вырашаюцца судом або гаспадарчым судом у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй, устаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, без збірання дзяржаўнай пошліны.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

3 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск. № 2343-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб страхаванні"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб страхаванні" з дня яго апублікавання.

2. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін з дня ўступлення Закона ў сілу:

прадставіць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб страхаванні";

прывесці свае рашэнні ў адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб страхаванні" і забяспечыць перагляд міністэрствамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь нарматыўных актаў, якія супярэчаць дадзенаму Закону;

вызначыць адказнасць страхавых і перастраховачных арганізацый за парушэнне імі страхавога заканадаўства, а па пытаннях, якія патрабуюць вырашэння вышэйшага заканадаўчага органа, унесці прапановы ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь;

устанавіць размер аплаты за рэгістрацыю і ліцэнзаванне страхавых і перастраховачных арганізацый, іх адасобленых структурных падраздзяленняў і брокераў;

вызначыць для страхавых арганізацый, якія ажыццяўляюць абавязковае страхаванне, размер адлічэнняў у фонд папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў і парадак іх выкарыстання;

распрацаваць і зацвердзіць Палажэнне аб органе дзяржаўнага нагляду за страхавой дзейнасцю.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць перарэгістрацыю страхавых арганізацый, зарэгістраваных да ўступлення ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь "Аб страхаванні".

Устанавіць, што страхавыя арганізацыі, якія не прайшлі на працягу года з дня апублікавання дадзенага Закона перарэгістрацыю, спыняюць сваю дзейнасць.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

3 чэрвеня 1993 г. г.Мінск.

Народная газета

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ АДВАКАТУРЫ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Адвакатура ў Рэспубліцы Беларусь

Адвакатура ў Рэспубліцы Беларусь уяўляе сабой незалежны прававы інстытут, закліканы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь ажыццяўляць прафесійную праваабаронную дзейнасць.

Артыкул 2. Задачы адвакатуры

Галоўная задача адвакатуры — аказанне кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі фізічным і юрыдычным асобам пры ажыццяўленні абароны іх правоў, свабод і законных інтарэсаў.

Адвакатура ўдзельнічае ў растлумачэнні заканадаўства і прававым выхаванні грамадзян.

Сваёй дзейнасцю адвакатура служыць прынцыпам законнасці, справядлівасці і гуманізму.

Артыкул 3. Заканадаўства аб адвакатуры

Заканадаўства аб адвакатуры ў Рэспубліцы Беларусь складаецца з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і выдадзеных у адпаведнасці з ім нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь.

Правы і абавязкі адвакатаў пры выкананні даручэнняў па крымінальных, грамадзянскіх справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях рэгламентуюцца адпаведным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Права на юрыдычную дапамогу

Дзяржава гарантуе юрыдычную дапамогу ўсім, хто ў ёй мае патрэбу, без якога-небудзь абмежавання. У выпадках, прадугледжаных гэтым Законам, юрыдычная дапамога аказваецца бясплатна.

Любая фізічная і юрыдычная асоба на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь мае права звярнуцца за юрыдычнай дапамогай да адваката (па свайму выбару) для абароны сваіх правоў і законных інтарэсаў у судах, іншых органах і арганізацыях, у кампетэнцыю якіх уваходзіць вырашэнне адпаведных прававых пытанняў.

Затрыманаму, арыштаванаму або асуджанаму для аказання юрыдычнай дапамогі забяспечваюцца неабходныя ўмовы для сустрэч і кансультацый з адвакатам з захаваннем поўнай іх канфідэнцыяльнасці.

Прафесійная абарона правоў і законных інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб па крымінальных, грамадзянскіх справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях у следчых і судовых органах ажыццяўляецца толькі адвакатамі.

Артыкул 5. Віды юрыдычнай дапамогі, якая аказваецца адвакатамі

Адвакаты аказваюць наступныя віды юрыдычнай дапамогі:

даюць кансультацыі і растлумачэнні па юрыдычных пытаннях, вусныя і пісьмовыя даведкі па заканадаўству;

складаюць заявы, скаргі і іншыя дакументы прававога характару;

ажыццяўляюць прадстаўніцтва ў судах і іншых органах і арганізацыях па грамадзянскіх справах і справах аб адміністрацыйных правапарушэннях;

удзельнічаюць у папярэднім следстве і ў судзе па крымінальных справах у якасці абаронцаў, а таксама прадстаўнікоў пацярпеўшых, грамадзянскіх істцоў, грамадзянскіх адказчыкаў.

Адвакаты аказваюць фізічным і юрыдычным асобам таксама і іншую прававую дапамогу.

Артыкул 6. Аказанне фізічным асобам юрыдычнай дапамогі бясплатна

Юрыдычная дапамога аказваецца бясплатна калегіямі адвакатаў за кошт сваіх сродкаў істцам у судах першай інстанцыі пры вядзенні спраў, звязаных з працоўнымі праваадносінамі, аб спагнанні аліментаў, аб пакрыцці шкоды, прычыненай калецтвам або іншым пашкоджаннем здароўя, звязаным з работай, а таксама інвалідам I і II груп пры дачы кансультацый, якія не патрабуюць азнаямлення са справай, фізічным асобам, вызваленым ва ўстаноўленым дзеючым заканадаўствам парадку ад аплаты юрыдычнай дапамогі.

ГЛАВА 2. АДВАКАТЫ

Артыкул 7. Адвакат Рэспублікі Беларусь

Адвакатам Рэспублікі Беларусь можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, стаж работы па спецыяльнасці не менш трох гадоў або не мае такога стажу, але прайшоў стажыроўку тэрмінам ад шасці месяцаў да аднаго года ў адвакатуры, здаў кваліфікацыйны экзамен і атрымаў ліцэнзію на права займання адвакацкай дзейнасцю.

Адвакаты і стажоры не могуць знаходзіцца на службе ў дзяржаўных, грамадскіх і іншых арганізацыях, за выключэннем асоб, якія займаюцца навуковай або педагагічнай дзейнасцю.

Артыкул 8. Стажоры

Асобы, якія закончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы па спецыяльнасці правазнаўства, але не маюць трохгадовага стажу работы па гэтай спецыяльнасці, праходзяць у адвакатуры стажыроўку ад шасці месяцаў да аднаго года.

Пасля шасці месяцаў стажыроўкі стажор са згоды асобы, якая звярнулася за юрыдычнай дапамогай, і кіраўніка стажыроўкі можа выконваць даручэнні па аказанню юрыдычнай дапамогі ў органах папярэдняга следства, судах, органах дзяржаўнага кіравання і арганізацыях, за выключэннем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь і Вышэйшага гаспадарчага суда Рэспублікі Беларусь, Пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

Стажыроўка завяршаецца здачай экзамену Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў у парадку, які вызначаецца Палажэннем аб Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў.

У выключных выпадках, пры нездавальняючым выніку экзамену, стажыроўка можа быць прадоўжана на тэрмін да аднаго года. Пры паўторным нездавальняючым выніку экзамену стажор адлічаецца з адвакатуры па прафесійнай непрыгоднасці.

У перыяд праходжання стажыроўкі на стажора распаўсюджваюцца палажэнні гэтага Закона.

Артыкул 9. Памочнік адваката

Грамадзяне, якія маюць юрыдычную адукацыю, могуць быць прыняты ў якасці памочнікаў адвакатаў для выканання дапаможнай работы пры аказанні адвакатам юрыдычнай дапамогі.

Прыём у якасці памочніка адваката немагчымы пры наяўнасці адной з падстаў, указаных у артыкуле 10 гэтага Закона.

Памочнікі не валодаюць правамі адвакатаў і не дапускаюцца да вядзення спраў у органах дазнання, папярэдняга следства, судах і іншых дзяржаўных органах.

На памочніка адваката распаўсюджваецца абавязак захавання адвакацкай тайны.

Час работы ў якасці памочніка адваката ўключаецца ў стаж работы, неабходны для прыёму ў адвакатуру.

Умовы дзейнасці і парадак аплаты працы памочніка адваката вызначаюцца статутам калегіі (фірмы, бюро).

Артыкул 10. Абмежаванні да займання адвакацкай дзейнасцю

Да адвакацкай дзейнасці не дапускаюцца асобы:

1) прызнаныя ва ўстаноўленым парадку недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

2) якія раней учынілі наўмысныя злачынствы;

3) раней выключаныя (звольненыя) з адвакатуры, а таксама звольненыя з праваахоўных і іншых органаў па кампраметуючых абставінах.

Артыкул 11. Кваліфікацыйная камісія адвакатаў

Для вырашэння пытанняў аб допуску да адвакацкай дзейнасці дзейнічае Кваліфікацыйная камісія адвакатаў.

Кваліфікацыйная камісія адвакатаў зацвярджаецца міністрам юстыцыі Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню савета Саюза адвакатаў Рэспублікі Беларусь тэрмінам на тры гады ў складзе не менш 11 членаў з ліку адвакатаў, якія маюць стаж адвакацкай дзейнасці не менш 10 гадоў, вучоных-юрыстаў, прадстаўніка Міністэрства юстыцыі на падставе прапановы кіраўнікоў адвакацкіх аб'яднанняў і грамадскіх арганізацый.

Кваліфікацыйная камісія прымае экзамен у асоб, якія прэтэндуюць на права займання адвакацкай дзейнасцю, а таксама ўстанаўлівае адсутнасць падстаў, прадугледжаных артыкулам 10 гэтага Закона.

Свае пасяджэнні камісія праводзіць пры наяўнасці не менш двух трацей саставу. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад ліку прысутных. Пры роўнасці галасоў голас старшынствуючага з'яўляецца рашаючым.

Рашэнне Кваліфікацыйнай камісіі з'яўляецца канчатковым і абскарджанню не падлягае. Паўторная здача экзамену Кваліфікацыйнай камісіі дапускаецца не раней чым праз адзін год, за выключэннем стажораў, якія здаюць экзамен паўторна па сканчэнні тэрміну стажыроўкі.

Палажэнне аб Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў прымаецца саветам Саюза адвакатаў Рэспублікі Беларусь і зацвярджаецца міністрам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 12. Ліцэнзія на права займання адвакацкай дзейнасцю

Займацца адвакацкай дзейнасцю можа толькі асоба, якая атрымала ва ўстаноўленым парадку ліцэнзію.

Ліцэнзія на права займання адвакацкай дзейнасцю выдаецца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь на падставе рашэння Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў.

Ліцэнзія не выдаецца ў выпадках устанаўлення абставін, прадугледжаных артыкулам 10 гэтага Закона.

Адмова ў выдачы ліцэнзіі можа быць абскарджана ў суд на працягу месячнага тэрміну з дня вынясення рашэння.

ГЛАВА 3. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ДЗЕЙНАСЦІ АДВАКАТУРЫ

Артыкул 13. Адвакацкія аб'яднанні. Індывідуальная адвакацкая дзейнасць

Грамадзяне, якія атрымалі ва ўстаноўленым гэтым Законам парадку ліцэнзію на права займання адвакацкай дзейнасцю, маюць права ажыццяўляць яе як шляхам уступлення ў члены калегіі, так і ў прыватным парадку шляхам утварэння на добраахвотнай аснове іншых адвакацкіх аб'яднанняў (фірм, бюро, кантор) ці індывідуальна.

Калегіі адвакатаў утвараюцца па заяве групы заснавальнікаў. Вышэйшым органам калегіі адвакатаў з'яўляецца агульны сход (канферэнцыя) членаў калегіі, яе выканаўчым органам — прэзідыум калегіі.

У Рэспубліцы Беларусь утвараюцца абласныя і Мінская гарадская калегіі адвакатаў.

Заявы аб прыёме ў адвакацкія аб'яднанні разглядаюцца не пазней месячнага тэрміну органамі адвакацкага самакіравання ці кіраўніком аб'яднання.

Статуты калегій адвакатаў, іншых адвакацкіх аб'яднанняў падлягаюць рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Адвакаты, якія займаюцца адвакацкай дзейнасцю індывідуальна, павінны быць зарэгістраваны ў выканаўчым камітэце адпаведнага мясцовага Савета народных дэпутатаў ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Адвакацкія аб'яднанні не з'яўляюцца камерцыйнымі арганізацыямі, існуюць выключна за кошт адлічэнняў ад грашовых сродкаў, якія паступаюць ад фізічных і юрыдычных асоб за аказанне ім юрыдычнай дапамогі.

Размер адлічэнняў вызначаецца статутамі аб'яднанняў. Пры гэтым размер адлічэнняў грашовых сродкаў у фонд калегіі адвакатаў, які выкарыстоўваецца для ўтрымання калегіі і выплаты адлічэнняў у Пенсіённы фонд Рэспублікі Беларусь і Фонд сацыяльнага страхавання, не можа перавышаць 30 працэнтаў сродкаў, паступіўшых за аказанне юрыдычнай дапамогі фізічным і юрыдычным асобам.

Калегіі адвакатаў, іншыя адвакацкія аб'яднанні з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, маюць пячатку і штамп са сваёй назвай.

Парадак унутранай арганізацыі і дзейнасці калегій адвакатаў, іншых адвакацкіх аб'яднанняў, іх структура, статус кіруючых органаў і іншыя пытанні, якія датычацца дзейнасці ўказаных аб'яднанняў, вызначаюцца іх устаноўчымі дакументамі, калі іншае не агаворана гэтым Законам.

Артыкул 14. Юрыдычныя кансультацыі

Для аказання юрыдычнай дапамогі фізічным і юрыдычным асобам калегіямі адвакатаў па ўзгадненню з выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў ствараюцца юрыдычныя кансультацыі.

На юрыдычныя кансультацыі абласной, гарадской калегій таксама ўскладаюцца функцыі забеспячэння абароны па крымінальных справах па назначэнню органаў дазнання, папярэдняга следства і суда (у тым ліку ў выпадках, калі закон патрабуе неадкладнага аказання юрыдычнай дапамогі), па справах асоб, вызваленых ва ўстаноўленым парадку ад аплаты юрыдычнай дапамогі, а таксама бясплатнага аказання іншых юрыдычных паслуг.

Статус юрыдычных кансультацый вызначаецца адпаведнымі калегіямі адвакатаў.

Артыкул 15. Саюзы (асацыяцыі) адвакатаў

Адвакаты маюць права на добраахвотных пачатках аб'ядноўвацца ў рэспубліканскі і міжнародныя саюзы, асацыяцыі на пачатках індывідуальнага або калектыўнага членства.

Саюз адвакатаў Рэспублікі Беларусь ствараецца і дзейнічае ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца заканадаўствам аб грамадскіх аб'яднаннях грамадзян і гэтым Законам.

Саюз адвакатаў Рэспублікі Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы, распрацоўвае і зацвярджае Правілы прафесійнай этыкі адвакатаў Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 4. ГАРАНТЫІ АДВАКАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ, ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ АДВАКАТА

Артыкул 16. Гарантыі адвакацкай дзейнасці

Адвакат у сваёй дзейнасці незалежны і падпарадкоўваецца толькі закону.

Забараняецца ўмяшанне ў прафесійную дзейнасць адваката, патрабаванне ад яго паведамлення якіх-небудзь звестак, якія складаюць прадмет адвакацкай тайны, а таксама патрабаванне падобных звестак ад службовых асоб і тэхнічных работнікаў органаў адвакацкага самакіравання і адвакацкіх аб'яднанняў.

Прадметам адвакацкай тайны з'яўляюцца пытанні, па якіх асоба звярнулася за дапамогай, сутнасць кансультацый, парад і растлумачэнняў; атрыманых гэтай асобай ад адваката.

Звесткі, якія складаюць прадмет адвакацкай тайны, не могуць быць атрыманы ад адваката і выкарыстаны ў якасці доказаў у грамадзянскім, адміністрацыйным і крымінальным працэсах.

Усе органы і службовыя асобы Рэспублікі Беларусь прызнаюць і захоўваюць тайну кансультацый адваката з асобай, якой ён аказвае юрыдычную дапамогу, пры ажыццяўленні ім сваіх прафесійных абавязкаў.

Артыкул 17. Правы адваката

Адвакат мае права аказваць фізічным і юрыдычным асобам любую прававую дапамогу, у якой яны маюць патрэбу.

Адвакат, выступаючы ў якасці прадстаўніка або абаронцы, мае права:

1) прадстаўляць законныя інтарэсы фізічных і юрыдычных асоб, што звярнуліся за прававой дапамогай, ва ўсіх судах, дзяржаўных, прыватных, грамадскіх і іншых арганізацыях і аб'яднаннях, у кампетэнцыю якіх уваходзіць вырашэнне адпаведных прававых пытанняў;

2) самастойна збіраць, замацоўваць і прадстаўляць звесткі, што датычацца акалічнасцей справы;

3) запытваць даведкі, характарыстыкі і іншыя дакументы, неабходныя ў сувязі з аказаннем юрыдычнай дапамогі, з дзяржаўных, прыватных, грамадскіх і іншых арганізацый і аб'яднанняў, якія абавязаны ва ўстаноўленым парадку выдаваць гэтыя дакументы або іх копіі;

4) запытваць са згоды асобы, якая звярнулася за прававой дапамогай, меркаванні спецыялістаў для вырашэння пытанняў, што ўзніклі ў сувязі з выкананнем прынятага адвакатам даручэння аб аказанні юрыдычнай дапамогі і патрабуюць спецыяльных ведаў у галіне навукі, тэхнікі, мастацтва і іншых сферах дзейнасці;

5) бесперашкодна мець зносіны сам-насам са сваім давернікам, падазроным, абвінавачаным, падсудным, у тым ліку і з тымі, якія знаходзяцца пад вартай;

6) заяўляць хадайніцтвы, прыносіць ва ўстаноўленым парадку скаргі на неправамерныя дзеянні суда, органаў улады і кіравання, службовых асоб, што ўшчамляюць правы і законныя інтарэсы асобы, якая звярнулася за прававой дапамогай, а таксама правы адваката пры ажыццяўленні прафесійных абавязкаў;

7) прымяняць у сваёй прафесійнай дзейнасці тэхнічныя сродкі (камп'ютэры, відэа- і гуказапісваючую апаратуру, фота- і кінаапаратуру, размнажальную і іншую тэхніку).

Суд, любы іншы орган або службовая асоба не могуць адмовіць у прызнанні права адваката прадстаўляць інтарэсы асобы, якая звярнулася за юрыдычнай дапамогай.

Адвакат пры ажыццяўленні сваёй прафесійнай дзейнасці карыстаецца свабодай слова ў вуснай і пісьмовай формах у межах, вызначаных задачамі адвакатуры і палажэннямі гэтага Закона. Выказванні адваката, якія закранаюць гонар і годнасць боку, яго прадстаўніка, абвінаваўцы або абаронцы, сведкі, пацярпеўшага, эксперта, перакладчыка, не парушаюць Правілы прафесійнай этыкі адвакатаў, праследаванню не падлягаюць.

Артыкул 18. Абавязкі адваката

Адвакат у сваёй дзейнасці абавязаны дакладна і няўхільна выконваць дзеючае заканадаўства, выкарыстоўваць усе прадугледжаныя законам сродкі і спосабы абароны правоў і законных інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб, якія звярнуліся да яго за прававой дапамогай.

Адвакат павінен пастаянна падтрымліваць прэстыж сваёй прафесіі ў якасці ўдзельніка ажыццяўлення правасуддзя і грамадскага дзеяча.

Адвакат не мае права прыняць даручэнне па аказанню юрыдычнай дапамогі асобе ў выпадках, калі ён па дадзенай справе аказвае або раней аказваў юрыдычную дапамогу асобам, інтарэсы якіх супярэчаць інтарэсам асобы, што звярнулася, або ўдзельнічаў у якасці суддзі, пракурора, следчага, асобы, якая праводзіла дазнанне, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, сведкі, панятога, а таксама калі ў расследаванні або разглядзе справы прымае або прымала ўдзел службовая асоба, з якой адвакат знаходзіцца ў сваяцкіх адносінах.

Адвакат не мае права дзейнічаць насуперак законным інтарэсам асобы, якая звярнулася да яго за аказаннем юрыдычнай дапамогі, займаць прававую пазіцыю, не ўзгодненую з ёй, адмовіцца без уважлівых прычын ад прынятай на сябе абароны падазронага, абвінавачванага, падсуднага.

Адвакат не мае права прызнаваць даказанай віну свайго падабароннага, калі апошні яе адмаўляе. Прызнанне віны падабаронным не пазбаўляе адваката права аспрэчваць такое сцвярджэнне і прасіць аб апраўданні за недаказанасцю яго віны.

Па справах, па якіх юрыдычная дапамога ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам аказваецца адвакатам па назначэнню, вызваліць яго ад аказання гэтай дапамогі можа толькі орган, які яго назначыў.

Адвакату забараняецца купляць або іншым спосабам набываць з'яўляючыеся прадметам спрэчкі маёмасць і правы фізічных і юрыдычных асоб, якія звярнуліся да яго за прававой дапамогай, як на сваё імя, так і пад выглядам набыцця для іншых асоб.

ГЛАВА 5. ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ АДВАКАТАЎ

Артыкул 19. Дысцыплінарная адказнасць

Адвакаты падлягаюць дысцыплінарнай адказнасці за дзеянні, якія супярэчаць гэтаму Закону і нормам прафесійнай этыкі адваката.

Скаргі на дзеянні адвакатаў, звязаныя з ажыццяўленнем прафесійных абавязкаў, разглядаюцца адпаведнымі органамі і службовымі асобамі ва ўстаноўленым парадку ў межах іх кампетэнцыі з улікам патрабаванняў гэтага Закона. Пры выяўленні ў дзеяннях адваката — члена калегіі адвакатаў дысцыплінарнага праступка матэрыялы аб ім накіроўваюцца ў прэзідыум адпаведнай калегіі адвакатаў. Матэрыялы аб дысцыплінарных праступках членаў іншых адвакацкіх аб'яднанняў або адвакатаў, якія практыкуюць індывідуальна, накіроўваюцца ў Кваліфікацыйную камісію адвакатаў.

Артыкул 20. Дысцыплінарныя спагнанні

Дысцыплінарнымі спагнаннямі, якія могуць быць прыменены да адвакатаў, з'яўляюцца:

1) ганьбаванне;

2) вымова;

3) строгая вымова;

4) выключэнне з адвакатуры.

Прымяненне меры спагнання, прадугледжанай пунктам 4 часткі першай гэтага артыкула, цягне ануляванне ліцэнзіі адваката.

Артыкул 21. Парадак прымянення і абскарджання дысцыплінарных спагнанняў

Справа аб дысцыплінарнай адказнасці адваката можа быць узбуджана і разгледжана органамі адвакацкага самакіравання, а ў адносінах да адвакатаў, якія займаюцца прыватнай практыкай, — Кваліфікацыйнай камісіяй адвакатаў.

Прадстаўленне аб узбуджэнні дысцыплінарнага вядзення справы супраць адваката праводзіцца на падставе прадстаўлення любога органа або па скарзе зацікаўленай асобы на дзеянні адваката.

Адвакат, у адносінах да якога ўзбуджана дысцыплінарнае вядзенне справы або крымінальная справа, можа быць часова адхілены ад выканання прафесійных абавязкаў органам, у вядзенні якога ёсць справа, на тэрмін да яе разгляду, але не больш чым на адзін год.

У выпадку апраўдання па крымінальнай справе або з'яўлення рэабілітуючай падставы для спынення дысцыплінарнага вядзення справы орган, па патрабаванню якога прынята рашэнне аб адхіленні адваката ад выканання прафесійных абавязкаў, выплачвае адвакату яго сярэдні заработак за ўвесь час, на які ён быў адхілены.

Дысцыплінарнае спагнанне можа быць абскарджана ў судовым парадку ў месячны тэрмін з дня прымянення спагнання.

Артыкул 22. Тэрміны даўнасці

Дысцыплінарнае вядзенне справы не можа быць узбуджана, а ўзбуджанае падлягае спыненню, калі з моманту ўчынення праступка мінула шэсць месяцаў, а па выніках рэвізіі або праверкі фінансавай дзейнасці — два гады, не лічачы перыяду часовай непрацаздольнасці адваката, знаходжання яго ў водпуску, часу знаходжання справы ў дысцыплінарным вядзенні.

Дысцыплінарныя спагнанні прымяняюцца не пазней аднаго месяца з дня яго выяўлення, не лічачы перыяду часовай непрацаздольнасці адваката або знаходжання яго ў водпуску.

Артыкул 23. Зняцце дысцыплінарнага спагнання

Калі адвакат на працягу аднаго года з дня прымянення дысцыплінарнага спагнання не ўчыніць новага праступка, ён лічыцца не падвергнутым дысцыплінарнаму спагнанню.

Па хадайніцтву зацікаўленага боку органам, узбудзіўшым дысцыплінарнае вядзенне справы, можа быць праведзена датэрміновае зняцце дысцыплінарнага спагнання, але не раней чым праз шэсць месяцаў.

Артыкул 24. Спыненне членства. Пазбаўленне права на займанне адвакацкай дзейнасцю. Ануляванне ліцэнзіі

Членства ў калегіях адвакатаў спыняецца ў выніку адлічэння ці выключэння з калегіі адвакатаў.

Адлічэнне з калегіі адвакатаў праводзіцца:

па заяве адваката;

пры выявіўшайся немагчымасці выканання адвакатам сваіх абавязкаў па стану здароўя;

у выпадку займання адвакацкай дзейнасцю па-за калегіяй адвакатаў.

Выключэнне адвакатаў са складу калегіі адвакатаў праводзіцца ў выпадках:

учынення праступка, не сумяшчальнага са званнем адваката;

сістэматычнага парушэння гэтага Закона, Правіл прафесійнай этыкі або нядобрасумленнага выканання сваіх абавязкаў, калі за ўказаныя парушэнні раней ужо прымяняліся меры дысцыплінарнага ўздзеяння;

выяўлення абставін, якія сведчаць аб незаконных дзеяннях адваката пры атрыманні ліцэнзіі на права займання адвакацкай дзейнасцю.

Спыненне права займання прыватнай адвакацкай дзейнасцю ў іншых адвакацкіх аб'яднаннях ці індывідуальна праводзіцца на падставах, прадугледжаных часткамі другой (за выключэннем абзаца чацвёртага) і трэцяй гэтага артыкула.

Пазбаўленне права займання адвакацкай дзейнасцю дапускаецца таксама ў выпадках утойвання даходаў ад падаткаабкладання.

Ануляванне ліцэнзіі на права займання адвакацкай дзейнасцю праводзіцца па прадстаўленню Прэзідыума калегіі адвакатаў ці Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Асоба, у адносінах да якой прынята ва ўстаноўленым парадку рашэнне аб выключэнні са складу членаў калегіі, спыненні права займання адвакацкай дзейнасцю, мае права ў месячны тэрмін абскардзіць указанае рашэнне ў суд.

ГЛАВА 6. ПРАЦА АДВАКАТАЎ, ЯЕ РЭГУЛЯВАННЕ І АПЛАТА. ПАДАТКААБКЛАДАННЕ. СТРАХАВАННЕ АДВАКАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Артыкул 25. Рэгуляванне працы адвакатаў

Праца адвакатаў рэгулюецца гэтым Законам, выдаваемымі ў адпаведнасці з ім іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь і статутамі адвакацкіх аб'яднанняў.

Праца адвакатаў арганізуецца ў адпаведнасці з Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку адвакацкага аб'яднання.

На адвакатаў не распаўсюджваюцца нормы працоўнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Адвакат карыстаецца правам на водпуск, на дапамогу па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і на дзяржаўнае пенсіённае забеспячэнне.

Назначэнне і выплата адвакатам дапамог па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і дзяржаўнае пенсіённае забеспячэнне адвакатаў праводзяцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Адвакаты маюць права ўтвараць фонды для сацыяльных патрэб.

Артыкул 26. Аплата працы адвакатаў і іншых работнікаў адвакацкіх аб'яднанняў

Праца адвакатаў аплачваецца са сродкаў, паступіўшых ад фізічных і юрыдычных асоб за аказаную ім прававую дапамогу.

Размер ганарару вызначаецца пагадненнем бакоў.

Размер аплаты працы адваката за кошт дзяржаўнага бюджэту вызначаецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Аплата працы адваката пры аказанні юрыдычнай дапамогі асобе, вызваленай ад аплаты юрыдычнай дапамогі па рашэнню загадчыка юрыдычнай кансультацыі або Прэзідыума калегіі адвакатаў, праводзіцца са сродкаў калегіі.

Умовы і размер аплаты працы службовых асоб, іншых работнікаў адвакацкіх аб'яднанняў вызначаюцца іх кіруючымі органамі (кіраўнікамі) у адпаведнасці з патрабаваннямі статутаў і дзеючым заканадаўствам.

Умовы і размер аплаты працы работнікаў, што выкарыстоўваецца адвакатамі, якія займаюцца адвакацкай дзейнасцю індывідуальна, вызначаюцца дзеючым заканадаўствам.

Артыкул 27. Падаткаабкладанне даходаў, атрыманых ад займання адвакацкай дзейнасцю

Адвакаты выплачваюць падаходны падатак з усёй сумы заработку, які яны атрымліваюць, за вылікам дакументальна пацверджаных расходаў, звязаных з адвакацкай дзейнасцю, уключаючы сумы, што накіроўваюцца на сацыяльнае страхаванне, а адвакаты — члены калегій адвакатаў — за вылікам сум, што накіроўваюцца ў фонд калегіі адвакатаў.

Утойванне ад падаткаабкладання даходаў, атрыманых за аказанне юрыдычнай дапамогі, з'яўляецца падставай для анулявання ліцэнзіі, якая дае права на займанне адвакацкай дзейнасцю (артыкул 24 гэтага Закона).

Калегіі адвакатаў выплачваюць узносы на сацыяльнае страхаванне і вызваляюцца ад агульнадзяржаўных падаткаў, збораў і іншых плацяжоў. Мясцовыя падаткі і зборы выплачваюцца калегіямі адвакатаў у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Артыкул 28. Страхаванне адвакацкай дзейнасці

У мэтах фінансавання мер па сацыяльнай абароне адвакатаў у адвакацкіх аб'яднаннях могуць быць створаны страхавыя фонды адвакатаў.

Правілы ўтварэння, парадак выплаты, размер адлічэнняў у страхавы фонд вызначаюцца агульным сходам членаў калегіі адвакатаў, іншага адвакацкага аб'яднання.

ГЛАВА 7. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 29. Адвакатура і дзяржава

Дзяржава забяспечвае незалежнасць дзейнасці адвакатуры, даступнасць юрыдычнай дапамогі, а таксама супрацоўніцтва дзяржаўных органаў і органаў адвакацкага самакіравання ў справе забеспячэння абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, аказання прававой дапамогі фізічным і юрыдычным асобам.

Артыкул 30. Адвакатура і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў і іх выканаўча-распарадчыя органы ў межах сваёй кампетэнцыі:

1) на платнай аснове забяспечваюць калегіі адвакатаў, юрыдычныя кансультацыі прыгоднымі для работы памяшканнямі, аказваюць садзейнічанне ў забеспячэнні памяшканнямі іншым адвакацкім аб'яднанням, адвакатам, якія займаюцца адвакацкай дзейнасцю індывідуальна;

2) аказваюць садзейнічанне ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, вырашэнні жыллёва-бытавых і іншых сацыяльных пытанняў, у неабходных выпадках прадастаўляюць адвакатам і адвакацкім аб'яднанням ільготы, у тым ліку па арэнднай плаце за памяшканні, якія выкарыстоўваюцца;

3) ажыццяўляюць іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на забеспячэнне даступнасці юрыдычнай дапамогі, супрацоўнічаюць у гэтых мэтах з органамі адвакацкага самакіравання.

Артыкул 31. Адвакатура і Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі:

1) аказвае садзейнічанне ў ажыццяўленні мерапрыемстваў па павышэнню кваліфікацыі адвакатаў;

2) збірае і вывучае статыстычныя даныя аб дзейнасці адвакатуры, распаўсюджвае станоўчы вопыт работы адвакатаў, аказвае калегіям адвакатаў, іншым адвакацкім аб'яднанням метадычную дапамогу;

3) прымае меры да абароны адвакатаў ад праследаванняў, неабгрунтаваных абмежаванняў і замахаў у сувязі з іх прафесійнай дзейнасцю;

4) выдае і анулюе ліцэнзіі на права займання адвакацкай дзейнасцю;

5) сумесна з Саюзам адвакатаў Рэспублікі Беларусь забяспечвае работу Кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў;

6) аказвае садзейнічанне ў матэрыяльна-тэхнічным, інфармацыйна-прававым забеспячэнні дзейнасці калегій адвакатаў.

Артыкул 32. Адвакатура і іншыя грамадскія аб'яднанні

Адвакатура ажыццяўляе супрацоўніцтва з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі юрыстаў, іншымі грамадскімі аб'яднаннямі грамадзян у справе забеспячэння законнасці і правапарадку, прававога выхавання грамадзян, вывучэння правапрымяняльнай практыкі, падрыхтоўкі ўзаемаўзгодненых прапаноў па ўдасканаленню заканадаўства і па іншых напрамках.

Парадак і ўмовы ўзаемаадносін адвакацкіх аб'яднанняў з іншымі грамадскімі аб'яднаннямі вызначаюцца іх статутамі, а таксама дагаворамі (пагадненнямі).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

15 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2406-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб адвакатуры"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адвакатуры" з дня яго апублікавання.

2. Устанавіць, што нормы гэтага Закона аб праве адваката самастойна збіраць і замацоўваць звесткі, якія датычацца акалічнасцей справы, прымяняюцца з моманту ўвядзення ў дзеянне новых Крымінальна-працэсуальнага і Грамадзянскага працэсуальнага кодэксаў Рэспублікі Беларусь.

3. Нормы Закона Рэспублікі Беларусь "Аб адвакатуры", якія датычацца выдачы ліцэнзій на права займання адвакацкай дзейнасцю, прымяняюцца з моманту ўвядзення ў дзеянне Палажэння аб кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў Рэспублікі Беларусь.

4. Савету Саюза адвакатаў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін прыняць, а міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь зацвердзіць Палажэнне аб кваліфікацыйнай камісіі адвакатаў.

5. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін прывесці пастановы і распараджэнні Савета Міністраў у адпаведнасць з гэтым Законам.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

15 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
№ 2407-XII

ЗАМЕЖЖА

* ІТАР-ТАСС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

Пульс дня

Рыхтуюцца да палётаў над Босніяй

12 самалётаў ВПС ЗША А-10 і А-10 "Тандэр Болт" перакідваюцца з Германіі ў Італію на ваенна-паветраную базу Авіяна, за 50 міль ад Венецыі, для падрыхтоўкі да ўдзелу ў аперацыях па ахове з паветра "зон бяспекі" ў Босніі, паведаміла камандаванне ўзброенымі сіламі ЗША ў Еўропе. Аперацыі ў Босніі мяркуецца праводзіць сіламі ВПС НАТО. Разам з самалётамі на базу ў Авіяна перакідваюцца для іх матэрыяльна-тэхнічнага абслугоўвання 270 ваеннаслужачых.

Шпіянаж пад журналісцкім прыкрыццём

Нягледзячы на магчымыя дыпламатычныя праблемы паміж Паўднёвай Карэяй і Японіяй, сеульскія ўлады арыштавалі ў аўторак акрэдытаванага тут загадчыка бюро японскай тэлекампаніі "Фудзі тэрэбі" Масато Сінахару, які абвінавачваецца ў ваенным шпіянажы.

39-гадовы Сінахара абвінавачваецца ў парушэнні закона аб абароне ваенных сакрэтаў у сувязі з тым, што атрымаў ад афіцэра міністэрства абароны Паўднёвай Карэі сакрэтныя дакументы і перадаў іх японскаму ваеннаму аташэ ў Сеуле.

Косава — пад кантроль ААН?

Аўтаномны край Косава павінен знаходзіцца пад кантролем ААН, каб прадухіліць распаўсюджанне канфлікту, які пагражае выліцца ў буйную вайну на Балканах. Такі падыход выказаў у інтэрв'ю шведскай газеце "Дагенс нюхецер" прэзідэнт Албаніі Салі Берыша.

На яго думку, нерэалістычна зыходзіць з таго, што Косава з'яўляецца часткай Сербіі. З прыбыццём прадстаўнікоў ААН праблема павінна вырашацца за сталом перагавораў, у ходзе якіх магчымы розныя рашэнні. Адно з іх — стварэнне канфедэрацыі пры ўмове, што ўсе бакі "праявяць добрую волю".

Шлях ад міністра да салдата

Былы міністр абароны Грузіі Тэнгіз Кітавані лічыць, што далучэнне да ўзброеных сіл Грузіі ў Абхазіі злучэнняў прыхільнікаў экс-прэзідэнта З.Гамсахурдзія — гэта "выратаванне Грузіі".

"Тое, што Мінгрэлія (захад Грузіі) з намі, — сказаў ён у інтэрв'ю журналістам, — гэта ўжо залог поспеху". Будучыя ж адносіны афіцыйных улад і прыхільнікаў экс-прэзідэнта залежаць, на думку Т.Кітавані, ад палітыкі ўрада.

Т.Кітавані ў званні радавога прымае ўдзел у ваенных дзеяннях у Ачамчырскім раёне. Ён удзельнічаў у аперацыі па разблакіраванню трасы Сухумі — Ачамчыра. "Я — баец корпуса добраахвотнікаў "Ачыгвара", — заявіў Т.Кітавані, — і ва ўсім падпарадкоўваюся свайму камандзіру".

Навіны СНД

Прыняцце Канстытуцыі — "бяссэнсавая гонка"

"Бяссэнсавай гонкай" назваў работу над праектам новай Канстытуцыі лідэр Дэмакратычнай партыі Расіі (ДПР) Мікалай Траўкін. Выступаючы на прэс-канферэнцыі, ён сказаў, што "сённяшняя Канстытуцыя не пашкодзіла б рэформам, калі б яны праводзіліся з пазіцый інтарэсаў чалавека, а не Міжнароднага валютнага фонду". На думку М.Траўкіна, "калі Канстытуцыю прымуць заўтра, гэта стане канцом дзяржаўнасці Расіі". У ходзе пленарнага пасяджэння Канстытуцыйнай нарады прадстаўнікі ДПР не падпісалі тэкст праекта Канстытуцыі, бо, на іх думку, у ім не ўлічаны прапановы аб выраўноўванні статуса суб'ектаў Федэрацыі.

Не зліталіся над мірнымі жыхарамі

20—25 таджыкскіх сем'яў кішлака Сарыгор Шурабадскага раёна Таджыкістана загінулі ў выніку нападзення афганскіх маджахедаў і таджыкскай апазіцыі ў аўторак раніцай на 12-ю заставу маскоўскага пагранатрада. Пра гэта ў інтэрв'ю "Інтэрфаксу" паведаміў міністр замежных спраў Рэспублікі Таджыкістан Рашыд Алімаў. Сам кішлак, паводле слоў міністра, "па-варварску разрабаваны і спалены". Ён асобна адзначыў, што ўпершыню ў ходзе канфлікту на таджыкска-афганскай граніцы загінулі грамадзянскія асобы.

Яшчэ адна рэспубліка?

Калінінградская вобласць можа следам за некаторымі іншымі абвясціць сябе рэспублікай, "калі ў Цэнтра не будзе нармальнага разумення тых праблем і асаблівасцей, якія існуюць на гэтай адарванай ад Расіі тэрыторыі". Аб гэтым папярэдзіў федэральныя ўлады народны дэпутат Расіі, старшыня Калінінградскага абласнога Савета Юрый Сямёнаў, выступаючы на брыфінгу, які быў прысвечаны распрацоўцы Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі.

Цэнтральным пытаннем новага Асноўнага Закона ён лічыць прынцып роўнасці суб'ектаў Федэрацыі, які трактуецца сёння па-рознаму. Таму, мяркуе кіраўнік Савета, неабходна сабраць кіраўнікоў абласцей, краёў і рэспублік і сумесна знайсці ўзгодненую формулу.

Чэчня ў ролі "язвы"

Старшыня Савета нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета Расіі Рамазан Абдулаціпаў, выступаючы на нарадзе ў Дагамысе, спыніўся на становішчы вакол Чэчні. Ён назваў Чэчэнскую Рэспубліку "язвай, якая распаўсюджваецца на іншыя рэспублікі". Ён адзначыў, што Чэчня заахвочвае фундаменталісцкія сілы ісламскага накірунку, і выказаў недаўменне тым фактам, што іншыя рэспублікі рэгіёна не выказваюць сваіх адносін да яе дзеянняў. На думку Рамазана Абдулаціпава, у бліжэйшы час трэба прымаць нейкія дзеянні ў адносінах да Чэчні.

Спецслужбы

Лідэры "сямёркі" спалі спакойна...

Рыхтуючыся да прайшоўшай у Токіо сустрэчы лідэраў краін "вялікай сямёркі", спецслужбы Японіі абучылі каля 800 агентаў, сярод якіх былі і жанчыны, асобым прыёмам для аховы ўдзельнікаў сустрэчы.

❑ На адной з трэніровак японскай спецслужбы.

Крошка-сын к отцу пришел... И получил взбучку

Ким Чен Ир, сын президента КНДР Ким Ир Сена, его официальный наследник на посту главы государства, по-видимому, получил взбучку от отца. После резкой критики у Ким Чен Ира был нервный срыв, который отразился на общем состоянии его здоровья. Почти два месяца он не у дел. Известно, что в конце апреля — начале мая в Пхеньян были вызваны западные врачи-невропатологи. Корейские работники среднего и выше среднего уровня утверждают, что Ким Чен Ир, "неделями не выходя из кабинета, переутомился на работе и находится на отдыхе и лечении".

